Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ 17 студзеня 1932 г. № 14 (3403)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: К. Гей—На шляху да новых дасягненьняў.
Устанавіць персональную адказнасьць за захаваньне маладняка (2 стар.).
Галавацяпы з Магілеўскага Саюзтрасу згналі вагон лёнавалакна (3 стар.).
Скончыць збожжазагатоўкі да 23 студзеня (3 стар.).
Змагацца за ператварэньне школы ў сапраўды палітэхнічную (3 стар).
ЗА МЯЖОЙ: Падрыхтоўка да акупацыі ўнутранай Манголіі. Забастоўка 19 тыс. тэкстыльшчыкаў.
ПА СССР. Першы савецкі дызэль. Будаўніцтва 4-х блюмінгаў.

К. Гей

На шляху да новых дасягненьняў

Камуністычная партыя Беларусі знайшла вялікі шлях паміж XIII і XIV сваімі зьездамі. Асноўныя рухі гаспадарчым жыцьці БССР характарызуюцца такімі, напрыклад, паказьнікамі: удзельная вага прамысловай прадукцыі складала ў 1930 г. 38,7 проц. у адносінах да ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі; у 1931 годзе гэтая ўдзельная вага ўзьнялася да 50,4 проц. У сельскай гаспадарцы значна вырасьлі, пашырыліся і ўмацаваліся саўгасы; калектывізацыя, якая ахапляла да моманту XIII зьезду КП(б)Б (май 1930 г.) 11-12 пр. сялянскіх гаспадарак, узьнялася да 50,4 проц. да пачатку 1932 году. Гэта забясьпечыла пераважную ролю сацыялістычнага сэктару ў таварнай прадукцыі сельскае гаспадаркі.

Прамысловасьць БССР разьвівалася ў 1930-31 г. тэмпамі больш высокімі, чым агульнасаюзныя. Калі штогадовы прырост прадукцыі прамысловасьці па Саюзе на працягу першых 3-х год пяцігодкі складаў 21-24 пр., то для БССР адпаведныя лічбы давалі ў 1928-29 г.—40,8 проц., у 1930 годзе—61 проц., у 1931 г.—79 проц. Уступіў у строй дзейных фабрык і заводаў рад новых прадпрыемстваў, сярод іх—Белдрэс імя Сталіна, магілеўская фабрыка штучнага валакна, завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі (сілаасарэзкі), віцебская швейная і трыкатажныя фабрыкі і рад іншых. На чарзе пуск крычаўскага цэмантнага заводу, гомельскай мэханізаванай гуты, дрэваапрацоўчага камбінату ў Гомелі і г. д.

Адзін гэты пералік найбольш буйных аб'ектаў капітальнага будаўніцтва апошняга часу ўжо дае ўяўленьне аб напрамку разьвіцьця прамысловасьці БССР у бок выкарыстаньня мясцовых сырцовых рэсурсаў. Старое ўяўленьне аб Беларусі, як аб краіне, якая ня мае сваёй сырцовай базы для прамысловасьці, павінна быць рашуча адхілена. Моцную сырцовую базу ў БССР маюць дрэваапрацоўчая, папяровая, тэкстыльная (лён і штучнае валакно), шкляная, броварная, крухмальная прамысловасьць і розныя віды харчовай прамысловасьці. У бліжэйшым будучым вялікую ролю ў прамысловым разьвіцьці БССР адыгрываюць хімічная прамысловасьць (фасфарыты, ацэтон, лесахімія, пераапрацоўка сапрапэлітавых паклалаў і рад іншых вытворчасьцяй), выраб будаўнічых матар'ялаў (цэмант, агнятэрпоры, кераміка, новыя будматар'ялы) і, нарэшце, мэталяапрацоўчая прамысловасьць, якая мае ўсе пэрспэктывы для свайго разьвіцьця, апіраючыся на тавары водны шлях, які зьвязвае БССР з паўднёвай мэталюргічнай базай.

Шпаркі рост прамысловасьці БССР, якая выканала сваю пяцігодку за тры з паловай гады, паставіў перад КП(б)Б ва ўвесь рост пытаньне аб энэргетычнай базе, якая забясьпечыла-б высокія тэмпы прамысловага разьвіцьця. Такой базай ва ўмовах БССР можа зьявіцца толькі торф. Ні лес, які вельмі зьменшыўся і да таго-ж багаты кантоўнымі пародамі, якія ідуць у пераапрацоўку на будаўніцтва, ні шматлікія рэкі, як правіла, якія маюць малы спад і нізкія берагі, ня могуць вырашыць апалавай энэргетычную праблему БССР ня толькі для бліжэйшага будучага, але і для данага часу. Прывозны апал таксама не прадстаўляе сабою, вядома, вырашэньня гэтай праблемы. Перад КП(б)Б стаіць, такім чынам, задача асвоіць торф, як асноўную крыніцу жыўленьня электрастанцый і заводзкіх сілавых установак. Іменна пад гэтым кутом погляду зьяўляюцца асабліва недапушчальнымі тыя прарывы ў торфаздабычы, якія мелі месца летам 1931 г. Абязьлічка і ўраўні даўка—дрэнная арганізацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва, невыстарчальная ўвага з боку раду партарганізацыі да гэтых пытаньняў былі асноўнымі прычынамі, якія абумовілі гэтыя прарывы.

Праводзячы і ў далейшым барацьбу за асваеньне мясцовых апалавых і сырцовых рэсурсаў, КП(б)Б павінна на XIV зьезьдзе падвесьці вынікі правядзеньня ў жыцьцё 6 умоў тав Сталіна. За паўгода, якія прайшлі з часу гістарычнага выступленьня тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, па ўсіх прадпрыемствах БССР узрос пропант працуючых зьдзельна, скарацілася цяжкучасьць, заключаюцца дагавары з калгасамі на пастаўку рабочай сілы, паленшылася абслугоўваньне культурна-бытавых патрэб рабочых, разгарнуўся шырокі рух за стварэньне гасдагавора-разрахункавых брыгад, за прымацаваньне работніка да пэўнага станку, агрэгату, за павышэньне ад казнасьці, за скарачэньне браку і г. д.

Аднак, рашучага зруху дабіліся толькі тыя прадпрыемствы, якія сапраўды па-большавіцку змагаліся за выцьцяўленьне ўказаньняў правады партыі і рабочай клясы—т. Сталіна. У большасьці прадпрыемстваў сустракаецца яшчэ ў розных формах рад выпадкаў і ўраўнілаўкі і аблязьлічкі. Вельмі марудна адбываецца перараход ад групавой зьдзельшчыны да індывідуальнай, мае месца рад скажэньняў пры ўвядзеньні прагрэсіўнай аплаты, што прыводзіла да павышэньня зарплаты па-за ўсякай залежнасьцю ад павышэньня паказальнікаў працы. Укараненьне гаспадарчага разрахунку сустрэла апартуністычнае супраціўленьне з боку часткі гаспадарчых і прафсаюзных работнікаў.

Такім чынам, асноўнай задачай надыходзячага XIV зьезду КП(б)Б зьявіцца мабілізацыя партыйнай арганізацыі на далейшую барацьбу за ажыцьцяўленьне 6 гістарычных указаньняў тав. Сталіна.

Побач з выкананьнем колькасных паказальнікаў, неабходна мабілізаваць партыйныя арганізацыі на бязумоўнае выкананьне якасных паказальнікаў.

У галіне сельскай гаспадаркі асноўная ўвага КП(б)Б павінна быць скана цэнтравана на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і паляпшэньні работы саўгасаў. Гэтыя задачы можна ажыцьцявіць толькі пры ўмове правядзеньня тых-жа ўмоў, пры стасоўна да канкрэтнай абстаноўкі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі. Абсьледваньне 40 калгасаў, праведзенае ў пэрыяд веснавой сяўбы, паказвае выкарыстаньне рабочай сілы калгасаў усяго на 57 проц., злы ход на іншыя работы па-за калгасам складаў 8 проц. Значыцца, 35 проц. наяўных у калгасах чалавека-дзён засталіся невыкарыстанымі. Гэтыя лічбы паказваюць, якія вялізарныя магчымасьці далейшага разьвіцьця калгаснай гаспадаркі застаюцца яшчэ нерэалізаванымі. Калі нават улічыць, што пэўная частка працоўных рэсурсаў калгасаў будзе выкарыстана больш шырока ў прамысловасьці, будаўніцтве і па іншых адыходных работах, у калгасах застаецца вельмі значны лішак рабочых рук, які даваліе пры правільнай арганізацыі працы шпарка ісьці па шляху спэцыялізацыі і інтэнсыфікацыі калгаснай гаспадаркі.

Паказальнікі работы сьведчаць аб вялікіх ёрухах у галіне сельскай гаспадаркі, значна пашырыліся пасеўныя плошчы пад ільном, якія дасягнулі ў 1931 г. 239.000 га, прычым удзел калгасаў у пасевах ільну вывіўся ў 51,6 проц. пры наяўнасьці 35-40 пр. ахопу калектывізацыяй вясной 1931 году. Гадавы плян камплектаваньня калгасных МТФ быў выкананы на 1-е сьнежня 1931 г. у разьмеры 107,9 проц., па сьвіноў гадоўчых фармах—у разьмеры 79,7 Сьвіноў стада ў саўгасах вырасла са 175 тыс штук да 200 тыс. у 1931 г. Стада рагатай жывёлы ў саўгасах вырасла з 38,7 тыс. да 75,9 тыс. штук.

Гэтыя лічбы, таксама як і хуткі рост машынізацыі сельскае гаспадаркі, сьведчыць аб тым, што спэцыялізацыя с.-г. БССР у кірунку разьвіцьця тэхнічных культур, малочнай жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі ідзе шырокімі крокамі ўперад, прычым сапыліцтычны сэктар займае бясспрэчна вядучую і кіруючую ролю ў гэтых працэсах. Аднак, пры ацэнцы гэтых рэзультатаў нельга ні на хвіліну забываць таго, што яны дасягнуты ва ўмовах выключна дрэнпай арганізацыі працы ў калгасах, у першы год далёка яшчэ ня поўнага правядзеньня зьвілельшчыны, пры наяўнасьці ўтрымаючых тэндэнцый, якія так яркі праявіліся, напрыклад, у саўгасах увосень мінулага году і г. д.

Апаводна з гэтым КП(б)Б павінна будзе выпрацаваць праграму работ па дыходзячага году, якая на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і паляпшэньня работы саўгасаў, высуне рад больш высокіх якасных патрабаваньняў.

Закранаючы пытаньне сельскай гаспадаркі, нельга не адзначыць памылак ЦК КП(б)Б дапушчаных летам 1931 году. Гэтыя памылкі ішлі на ліквідацыю недацэнкі задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і выяўляліся ў імкненьні скараціць тэрміны калектывізацыі БССР нават у адносінах да ўстановак, даных у вядомай пастанове ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1931 г. Пры дапамозе «Правды», якая дала выразную палітычную ацэнку гэтым памылкам, ЦК КП(б)Б пераглядзеў і выправіў свае дырэктывы і мабілізаваў партыйную арганізацыю на ажыцьцяўленьне ўказаньняў ЦК УсеКП(б) па калгасным будаўніцтве, ударыўшы адначасова па радзе выпадкаў пагоні за дутымі процантамі, якія мелі месца ў асобных раёнах БССР.

Дасягнутым посьпехам КП(б)Б у сацыялістычным будаўніцтве ў немалой ступені спрыяла пасьлядоўнае і правільнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі. Пасьля XIII зьезду КП(б)Б правяла далей рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам, выкрыўшы і разграміўшы контр-рэвалюцыйную дзейнасьць некаторых былых БНР'аўскіх міністраў. КП(б)Б ачысьчала свае рады ад нацыянал-апартуністычных элемэнтаў.

Адначасова КП(б)Б шырока пачала рызавала неабходнасьць рашучай барацьбы супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, і нанесла рад удараў па канкрэтных носьбітах гэтага ўхілу (Валь фсон, Выдра і рад іншых).

Кастрычніцкі (1930 г.) пленум ЦК КП(б)Б указаў на неабходнасьць узмацненьня работы па беларусізацыі і паклаў пачатак добраахвотнаму руху на прадпрыемствах за вывучэньне беларускай мовы, беларускай літаратуры, гісторыі і г. д.

Рашучая барацьба ўсёй партыйнай арганізацыі на чале з ЦК КП(б)Б супроць ігнараваньня работы серод нацыянальных меншасьцяй прыняла да прыкметнага палепшаньня абслугоўваньня нацменшасьцяй, выправіўшы, у прыватнасьці, рад грубых парушэньняў лініі партыі ў адносінах гэтай работы.

У барацьбе супроць галоўнай небясьпекі—правага апартунізму, а таксама супроць «лявацкіх» скажэньняў, супроць прымірэнцтва і гнілога лібэралізму да трацкісцкай кантрабанды, КП(б)Б пасьлядоўна праводзіла генэральную лінію партыі, забясьпечыўшы далейшы рост ідэйнай згуртаванасьці і павышэньне клясавай пільнасьці партыйнай арганізацыі.

Ідучы далей па гэтым-жа шляху непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, ня спыняючыся на дасягнутых посьпехах, па-бальшавіцку крытыкуючы асобныя памылкі і недахопы сваёй работы, КП(б)Б, абапіраючыся на праробленую вялікую работу, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, пойдзе наперад, да новых посьпехаў і дасягненьняў.

(«Правда»).

Лепшым ударнікам—пачэсныя граматы

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК Беларускай ССР аб узнагародзе лепшых ударнікаў Белшвэйаб'яднаньня пачэснымі граматамі Прэзыдыуму ЦВК БССР

У адзнаку выкананьня швэйнай прамысловасьцю БССР пяцігодкі за тры гады, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Узнагародзіць Пачэснымі граматамі Прэзыдыуму ЦВК БССР наступных лепшых ударнікаў швэйнай прамысловасьці БССР:

Пэйгіна, Абрама Гіршава,—студэнт тэкстыльна-швэйнага інстытуту, арганізатар будаўніцтва фабрыкі «Актябр»—за ўвядзеньне сыстэмы падзелу працы, за рацыяналізацыю вытворчасьці.

Каганава, Ліпу Залманава,—рабочы, вытворчы стаж 24 гады, у сучасны момант дырэктар фабрыкі «1 мая»—за баявую працу па арганізацыі вытворчасьці.

Лембэрга, Мэера Файвішава,—рабочы, вытворчы стаж 22 г., у сучасны момант дырэктар школы ФЗВ—Менск,—за прыкладную пастаноўку пэдагагічнай і вытворчай працы на першай фабрычны-школе, за энэргічную працу па падрыхтоўцы кадраў для швэйнай прамысловасьці.

Майзьлес Алену Пятроўну, работніца-вылучэнка ф-кі «Камінтэрн», у сучасны момант старшыня ЦК саюзу швэйнікаў,—за мабілізацыю мас на барацьбу за выкананьне пляну і разгортваньне самаспаборніцтва і ўдарніцтва.

Гурко, Франца Іванавіча, мэханік-вынаходца, вытворчы стаж 35 г., у сучасны момант старэйшы мэханік Белшвэйаб'яднаньня—за рэканструкцыю трансмісійнай гаспадаркі фабрыкі, за энэргічнае садзейнічаньне і ўдзел у пуску новых швэйных фабрык.

Гусмана, Ізраіля Давідавіча, спэцыяліст-закройшчык, вытворчы стаж 25 г.,—за выдатныя заслугі ў канструкцыях мужчынскай вопраткі і ў складаньні стандартаў пакрою.

Кац, Янку,—рабочы, вытворчы стаж 31 год, у сучасны момант працуе на ф-цы «Кастрычнік»,—за вытворчы энтузіязм і бальшавіцкія тэмпы працы.

Нізак, Гіршу,—рабочы, вытворчы стаж 32 г., лепшы ўдарнік арганізатар сыстэмы шыцьця-бесьперапынным струменем бручных процэсаў,—за лепшае вытворчае навучаньне брыгаднага вучнёўства.

Межынскую,—інструктар вытворчага вучастку пінжачнага агрэгату фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі»,—за ўзорныя тэмпы працы па выкананьні вытворчых заданьняў, за прыкладнае кіраўніцтва вытворчым вучасткам агрэгату

Стэрнінсона, Рувіма—рабочы, вытворчы стаж 25 год, у сучасны момант загадчык ТНБ—фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі», за лепшую арганізацыю нарміраваньня працы, распрацоўку тэхнолёгічных процэсаў, за актыўную арганізацыю вытворчасьці на грунце лепшай тэхнікі бесьперапыннага струменю.

2. Зьвярнуць судзімасьць тав. Берліна, Шолама Аронавіча, які быў асуджаны Вярхоўным Судом БССР 13-III-1931 г.—па арт. 196 КК БССР.

3. Даручыць Белшвэйаб'яднаньню забяспечыць неабходныя сродкі для таварышоў, узнагароджаных Пачэснымі граматамі Прэзыдыумам ЦВК, паводле гэтай пастановы, а таксама і іншых лепшых ударнікаў швэйнай прамысловасьці, якія паказалі ўзорныя прыклады працы і адданасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Старшыня Цэнтральнага Вык. Кам. БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Вык. Кам. БССР М. ГІЛЯКЕВІЧ.

15 студзеня 1932 г.
г. Менск.

На СССР

Першы савецкі дызэль

Рабочыя дызэльнага цэху Харкаўскага паравозабудаўнічага заводу закончваюць мэханічную апрацоўку дэталяў першага савецкага дызэля Д-40. Да гэтага часу Харкаўскі паравозабудаўнічы завод зьбіраў дэталі розных магутнасьцяў заграмічнай маркі «Зульцэр» і плацёў нямецкай фірме «бр. Зульцэр» па 2 даляры з кожнай конскай сілы. Магутны дызэль Д-40 сканструяваны цалкам тэхнічнымі сіламі Харкаўскага паравозабудаўнічага заводу; ён зьяўляецца першым савецкім дызэлем і аслабяне ўсё дызэлябудаўніцтва ад замежнай залежнасьці. Дызэль будзе пушчан ў эксплёатацыю да XVII партканфэрэнцыі.

***

Уступіў у эксплёатацыю Ленінгрэдскі завод імя Ленінгрэдскага Саюзстандартжылбуду (Таварышы), які вырабляе поўнакамплектныя стандартныя дамы. Поўная магутнасьць камбінату—600 тыс. кв. мтр. жыльлюшчы ў год. У 1932 г. праграма прадугледжвае будаўніцтва 230 тыс. кв. мэтраў жыльлюшчы. У камбінаце занята 3.500 рабочых.

***

Алейскі цукровы завод (Новасібірск) выпусьціў першыя вагоны цукру. Прадукцыя Алейскага цукровага заводу разьмяркавана па ваколічных раёнах. Завод на працягу году дасьць 16 тыс. тон цукру, што азначае скарачэньне на тысячу вагонаў цукру, увазімых з эўрапейскай часткі Саюзу. Паводле заключэньня спэцыялістаў, алейскі цукар добрай якасьці і ня ўступае лепшым гатункам украінскага.

Коксавы цэх Кузьнецкбуду

Кузьнецкі Коксахім амонат перад пускам

Першы кокс—да XVII партканфэрэнцыі

Кузьнецкбуд. Коксахімічны камбінат з кожным днём набліжаецца да моманту здачы ў эксплёатацыю. Уся сыстэма вуглепадрыхтоўкі апрабавана. Трансфарматорная падстанцыя Коксахіму прыняла ток для апрабаваньня матораў. Сёньня закончаны мантаж маста па труму.

Уся сыстэма каксаваньня і рампа гатова да эксплёатацыі. 15 студзеня заканчваюцца выпрабаваньні ўсіх машын коксавых печак. Тушыльны вагон і тушыльная вежа гатовы да работы.

Ударнікі Коксахіму заяўляюць, што першы кокс дадуць да XVII партканфэрэнцыі.

Будаўніцтва чатырох блюмінгаў

Ленінград. Іжорскі завод у 1932 г. павінен даць савецкай мэталюргіі 4 блюмінгі.

Рабочыя - іжорцы абавязаліся першы блюмінг здаць да і красавіка, другі—1 ліпеня, трэці — 1 кастрычніка і чацьверты — 30 сьнежня. Іжорцы пабаявому ўключыліся ў барацьбу за савецкія блюмінгі. Арганізаваны кантрольныя пасты для прасоўваньня дэталяў блюмінга.

Складзены плян падачы дэталяў з паказаньнем па групах. Гэты плян адобраны заводакіраўніцтвам. Па ўсіх цэхох праведзены вучот гатовых дэталяў.

Рабкоры газэты «Блюмінг» (штотыднёўка, мэханічнага цэху № 2) узьняли пытаньне аб перанясеньні гэтай масавай работы і на іншыя заводы Ленінграду, якія ўдзельнічаюць у выраве блюмінгаў. Такіх заводаў многа: «Чырвоны Пуцілавец», завод імя Леніна, «Рускі дызель», «Северная вэрфь», завод імя Марці, завод імя Сьвярдлова, «Электрасіла» і інш.

Рабкоры прапануюць арганізаваць у кінатэатрах Ленінграду перасоўную выстаўку па блюмінгабудаўніцтву з тэхнічнай кансультацыяй.

На БССР

✦ ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА «СПАРТАК», з 6 па 10 студзеня выпрацавала 111,576 тон паперы на суму 67.352 руб. За гэты час фабрыка выканала 66,9 проц. пляну. Процант прастою складае 26,3. З 1 па 10 выпрацавана 236,293 тоны паперы. Процант выкананьня за гэтую дзесяцідзённу складае 69,39. Прастой складае 26,2 проц.

✦ ДОБРУСКАЯ ФАБРЫКА «ГЕРОЙ ПРАЦЫ», за 13 студзеня павінна была выпусьціць 100 тон паперы. Фактычны выраб складае 24,2 проц.

✦ ПА ЎСІХ ЗАВОДАХ БЕЛТОРФУ, з 1 па 5 студзеня 1932 году, вывезена 9882,3 тоны торфу замест 23432,0 тон паводле пляну. Такім чынам, плян выканан на 42,1 проц. Адстаюць па ранейшаму: завод імя 1-га Мая, «Шлях Сацыялізму», «Давыдаўка» і «Новая Беларусь». Наперадзе ідуць:—«Вольніца», якая выканала плян на 131,1 проц., «Вялікі Мох»—112,5 проц. і завод імя Даўмана—132,6 проц.

✦ У ПАДАРУНАК КОЙДАНАЎСКАЙ РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ, Рубілкаўскі сельсавет, галавы плян па загатоўках на 5 студзеня выканаў на 106,4 проц. Калгас «Камунар» здаў паўтары тоны збожжа, а калгасьнікі гэтага сельсавету—34 центнэры.

✦ ЗА ПАСЬПЯХОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ 4-га кварталу, Гомелю прадстаўлена адно месца для ўдзелу ў гэтым тыражы пазыкі «3-ці рашаючы». Гомельскі гаркамсал прадставіў гэтае месца заводу Гомсельмаш за ўзорнае правядзеньне дадатковай подпіскі. Згодна пастановы агульнага сходу рабочых ліцейнага цэху на тыраж у Днепрапятроўск едзе рабочы гэтага цэху тав. Белазерскі.

✦ ВЫШЛА ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА ў шматтыражны чыгуна-ліцейнага машынабудаўнічага заводу «Камунар». Старонка зьмяшчае невялікі нарыс ударніка заклікання ў літаратуру тав. Фэльдмана і крытыку на нарыс «Рост», ударніка заклікання ў літаратуру т. Гольдмана.

✦ КАЛГАСЫ: «ЧЫРВОНЫ ЎСХОД», «НОВЫ ШЛЯХ», «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН», «ЧЫРВОНАЯ ЦЯСА» і «НОВАЯ БУДА», Мешкаўскага сельсавету, арганізавалі чырвоны абоз да Бабруйскай раённай партканфэрэнцыі. Абоз прыбыў у Бабруйск 11 студзеня.

✦ ПАШЫРАЕЦЦА КАМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА ГОР. ГОМЕЛЮ. На жыльлёвае будаўніцтва па лініі гарсавету вызначана 1 млн. 50 тысяч руб., на будаўніцтва і рамонт школ 260.000 руб. На каналізацыю асыгнавана 625 тыс. руб., на палепшаньне тратуараў, водзяй станцыі і брукаваньня асыгнавана 500,000 руб. У гэтым годзе будзе пашырана гарадская электрастанцыя, на якую асыгнавана 700.000 руб. Бюджэтам камгасу на 1932 год вызначана 45 тысяч руб. на пажарнае будаўніцтва.

✦ НАРАДА КРАМНІКАЎ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА высунула сустрэчны плян па пае накопленьні на 2760 руб. і 33 тыс. руб. па выручцы.

За мяжою

Падрыхтоўка да акупацыі унутранай Манголіі

ШАНХАЙ. Японскае войска працягвае прасоўвацца па напрамку да правінцыі Жэхэ (Унутарная Манголія). Японцы прасоўваюцца ў напрамку на сталіцу правінцыі Жэхэ—Чэндэ абыходным шляхам, бо ад ранейшага шляху прасоўваньня на Чэндэ па прамой лініі Цзіньчжоў — Чаоян японскаму камандваньню прыйшлося адмовіцца з прычыны аказанага японскім часьцям упартага супраціўленьня.

Прасоўваньне японскіх часьцей будзе адбывацца ў трох калёнах, з якіх кожная складаецца з укамплектаванай брыгады, па наступных трох напрамках:

першая калёна—праз Тунляо на Кайлун;

другая—з Чжан-у—на Суйдун;

трэцяя—з Сінлітуна—на Фусін.

Усьлед за тым будзе праведзены супольны наступ усіх калён на сталіцу правінцыі Жэхэ—Чандэ.

Сіпінгай-Таонаньская і Паўднёва-манчжурская чыгунка ўжо перавозяць войска па напрамку да Тунляо і Чжан-у.

Забастоўка 19 тысяч тэкстыльшчыкаў

ШАНХАЙ. 14-I. З прычыны антыяпонскага байкоту японскія тэкстыльныя фабрыкі ў Шанхаі працуюць з невялікай нагрузкай.

Прадпрыемцы, спасылаючыся на становішча, адмаўляюцца плаціць зарплату. Некаторыя фабрыкі абвясьцілі лёкаўт, у той-жа час большасьць неванятых рабочых абвясьцілі забастоўку пратэсту супроць нявыплаты зарплаты. Прадпрыемцы патрабуюць беза гаворачнага звароту на работу, пагражаючы канчатковым закрыцьцём фабрык. У канфлікт уцягнута каля 19.000 рабочых.

Учора некалькі сот рабочых напалі на японскую фабрыку. Паліцыя разагнала рабочых, некалькі рабочых паранена, многія арыштаваны.

Дзіцячая праца ў капіталістычных краінах.

7-мі гадовы газэтчык у Нью-Ёрку, які з ранку і да позьняга вечару прадае газэты.

За савецкую Нямеччыну—супроць капіталізму

Прэзыдэнцкія выбары пад лёзунгам—кляса супроць клясы

БЭРЛІН. ЦК кампартыі Нямеччыны высоўвае на прэзыдэнцкіх выбарах кандыдатуру правадыра кампартыі т. Эрнста Тэльмана.

У апублікаванай пастанове ЦК гаворыцца, што кампартыя Нямеччыны адносіцца да выбараў прэзыдэнта, як і да ўсіх астатніх выбараў і галасаваньняў, ня так, як да парляманцкай, а як па-за-парляманцкай кампаніі, як да складанай часткі барацьбы клясы супроць клясы пад лёзунгамі:

«Кляса супроць клясы!»

«Чырвоны адзіны фронт — супроць аб'яднанай рэакцыі ад Зэверынга да Гітлера!»

«За чырвонага рабочага кандыдата супроць кандыдата капіталу — Гіндэнбурга!»

«За кандыдата сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня, супроць кандыдата палітыкі кантрыбуцый і рэпарацый!»

«За кандыдата бедных, супроць кандыдата багатых!»

«За хлеб і свабоду, супроць галечы і прыгнечаньня!»

«За свабоду і сацыялістычную савецкую Нямеччыну ў саюзе з Савецкім Саюзам і сусьветным пралетарыятам — супроць абанкроціўшагася капіталізму!»

Кампартыя Нямеччыны заклікае ўсю рабочую клясу, усіх эксплёатаемых гораду і вёскі вылучыць дзесяткі тысяч чырвоных актывістаў на правядзеньне выбарчай кампаніі, вылучыць на ўсіх заводах і біржах працы чырвоных кандыдатэты адзінства.

***

Ротэ фанэ» піша: «Пастанова ЦК кампартыі выклікала гарачыя водгукі ва ўсім нямецкім пралетарыяце. Значэньне гэтай пастановы заключаецца ў тым, што кампартыя выступае на прэзыдэнцкіх выбарах, як і ва ўсіх эканамічных і палітычных баёх, за жыцьцёвыя інтарэсы рабочае клясы і ўсіх працоўных, пад сьцягамі самастойнай пралетарскай клясавай палітыкі.

Нямецкія рабочыя, працоўныя, эксплёатаемыя пласты, бачылі ў апошнія дні, як с.-д. Вельс, і Лейпарт, падобна Гугэнбэргу і Гітлеру, сталі за кандыдатуру маршала Гіндэнбурга. Рэакцыйны блёк новага фашысцкага «ўсенароднага супрацоўніцтва» падымае Гіндэнбурга на шчыт. Гіндэнбург, які падпісаў усе надзвычайныя дэкрэты, плян Юнга, зьяўляецца такім-жа кандыдатам с.-д. кіраўніцтва, як і кіраўніцтва нацыянал - сацыялістаў, як Брюнінгаў і Грэнэраў і капіталістаў з усе нямецкага аб'яднаньня індустрыі.

Тэльман супроць Гіндэнбурга! У гэтых імёнах выражаецца пропастаўленьне двух франтоў, дзьвёх клясаў.

Кампартыя, кіруючая сіламі адзінага чырвонага фронту, уздымае высока сьцяг будучай сацыялістычнай савецкай рэспублікі Нямеччыны супроць фронту надзвычайных дэкрэтаў, супроць юнгаўскай палітыкі, супроць фашызму, супроць капіталістычнай дыктатуры.

У заключэньне «Ротэ фанэ» заклікае ўсіх с.-д. рабочых стаць пад сьцягі адзінага чырвонага фронту.

***

Вестка аб выстаўленьні кандыдатуры кампартыі выклікала сёньня ажыўленае абгаварэньне на бэрлінскіх заводах і біржах працы. Рад с.-д. рабочых заяўляе, што яны аддадуць свае галасы не Гіндэнбургу, а кандыдату кампартыі.

Камуністы зьвязваюць сваю агітацыю з растлумачэньнем неабходнасьці разгортваньня штодзённай барацьбы на кожным заводзе, на кожнай біржы працы.

Адначасова гэтая вестка прывяла ў замяшаньне с.-д. кіраўніцтва. «Форвэртс» прабуе абмінуць мяўчэньнем гэты факт, паведамляючы аб im у двух радкох без камэнтараў. Затое рад іншых буржуазных газэт сёньня піша, што высоўваньне кандыдата кампартыі выклікала замяшаньне ў с.-д. кіраўніцтве, бо варта лічыцца з тым, што шмат якія с.-д. рабочыя нікоі ня стануць у адзіны фронт з Гітлерам і Вельсам за Гіндэнбурга, а аддадуць перавагу ўваходу ў рады чырвонага фронту.

Брандлерыянская газэта «Арбэйтэр палітык» жалка ляпеча аб тым, што кампартыя павінна, моў, прапанаваць кіраўніцтву сацыял-дэмакраты выставіць якога - небудзь сумеснага кандыдата. («Правда»).

Новы абвяргэт францускага ураду—бяз Брыяна

ПАРЫЖ. 14-I. Агенцтва Гавас паведамляе: «Лаваль сфармаваў новы ўрад. Лаваль пакінуў за сабой партфэль міністра замежных спраў. Катала (былы тав. міністра ўнутраных спраў у габінэце Лаваля) атрымаў партфэль міністра земляробства, Тард'е—вайсковага міністра, Фульд (былы тав. міністра земляробства ў габінэце Лаваля)—міністр земляробства. Урад будзе прадстаўлены палаце дэпутатаў 19 студзеня».

Такім чынам уся рэарганізацыя падаўшага ў адстаўку ураду Лаваля зводзіцца амаль выключна да таго, што адхілены Брыян.

Радыкальная «Валанто» выказвае ўпэўненасьць, што ўход Брыяна з пасьлітычнай арэны не канчатковы і што прэстыж яго яшчэ вырасьце. «Рэпублік» заяўляючы, што Брыян, натуральна, ня мог дазволіць Лавалю адхіліць сябе пэрсональна, піша, што здароўе Брыяна значна паленшылася, і што «апошнія слова, далёка яшчэ ня сказана». Брыян будзе разьбіраць на краіне і «абараняць сваю справу міру і нашу дактрыну». Сацыялістычная «Папюлер» заўважае, што Брыян імкнуўся падкрэсьліць гвалтоўны характар свайго адхіленьня з габінэту і тым самым пакінуў сабе магчымасьць актыўна выступіць на выбарах.

Правабуржуазныя «Фігаро» і «Ордр» гавораць, што ў апошнія ураднавым крызісе быў адзін добры момант: адхіленьне Брыяна з ураду.

Рэпарацыйны вузел распадаецца

ПАРЫЖ. 13-I. Паводле паведамленьня газэт, французкі праект вырашэньня пытаньня аб даўгох і рэпарацыях прадугледжвае ўстанаўленьне мараторыя на ўмоўныя частцы рэпарацыйных плацяжоў тэрмінам на два гады і ўнясеньне Нямеччынай замест бязумоўнай часткі плацяжоў эквівалентнай сумы аблігацыямі нямецкіх чыгунак.

У выніку прынятага на ініцыятыве французкага банку рашэньня праўленьнем Базэльскага банку міжнародных разьлікаў аб умоўным прадоўжаньні крэдытаў Рэйхсбанку толькі на месяц, французкі банк безадкладна ўвойдзе ў кантакт з фэдэральным рэзэрвным банкам ПАЗШ і ангельскім банкам.

Вітаючы рашэньне Базэльскага банку, як першы адказ Брюнінга, «Таймс» падкрэсьлівае, што «месячны тэрмін дае магчымасьць нямецкаму ўраду прадумаць і зразумець важнасьць рашэньняў і маючых быць перагавораў у Лазанне». Адначасова «Таймс» рэзка нападае на амэрыканскага сэнатара Рыда, заявіўшага, што «ў выпадку адмаўленьня Францыі ад плацяжоў Амэрыцы яе ўклады ў Амэрыцы дастатковы, каб забясьпечыць уплату даўгоў, калі па іх накласьці руку», і пагражае патрабаваньнем французкіх крэдытаў з ПАЗШ.

***

ЛЕНДАН. 13-I. (ТАСС). «Дэйлі тэлеграф» зазначае, што ў сувязі з дэкларацыяй Брюнінга Англія заняла зараз, як відаць, больш непрымірымую пазіцыю.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

За сацыялістычную жывёлагадоўлю

Устанавіць пэрсанальную адказнасьць

ЗА ЗАХАВАНЬНЕ МАЛАДНЯКА

Змагацца за якасьць, за таварнасьць сацыялістычнай жывёлагадоўлі

ЦК і СНК у сваёй пастанове аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі прама ўказваюць, што ў 1931 г. павінен быць закладзен цьвёрды фундамант для далейшага шпарка га разьвіцьця сацыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі.

Падагульваючы вынікі 1931 году мы павінны адзначыць аб значных перамогах, якія былі атрыманы на фронце сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Створана моцная сетка малочных таварных калгасных фэрм. У канцы 1931 году ў МТФ БССР было 146.312 галоў буйной рагатай жывёлы, з якіх 88.570 кароў. У 1039 цялячых фэрмах знаходзілася 47.290 галоў цялят. За мінулы год здана (прададзена) дзяржаве 246.130 цнт. малака. У аснoўным выканана задача па арганізацыі фэрм укамплектаваньня стада. Ёсьць пэўныя посьпехі і ў галіне стварэньня кармовай базы.

Далейшае разьвіцьцё жывёлагадоўлі павінна разгортвацца яшчэ больш шпаркімі тэмпамі. Гэта ў пэўнай ступені задержыць ад належнага догляду за жывёлай, правільнага кармленьня, ад забесьпячэньня правільнай зімоўкі.

ЦК і СНК у пастанове аб жывёлагадоўлі адзначаюць рэзкае адставаньне якасных паказчыкаў: дрэнны догляд за жывёлай, безгаспадарчасьць, у радзе месц высокі процант адыходу маладняка і г. д. Партыя і ўрад прапануюць ужыць самыя рашучыя захады да паляпшаньня догляду за жывёлай. Саўгасы і калгасныя фэрмы маюць усе магчымасьці, каб зьнішчыць гэтыя недахопы, каб дабіцца скарачэньня да мінімуму адходу маладняка.

Аднак, ня гледзячы на гэта ў радзе жывёлагадоўчых гаспадарак наглядаюцца нядбайныя адносіны да догляду за жывёлай, да ашчаднага выдаткаваньня кармоў.

Хутка пачнецца масавы ацёл кароў і апарос сьвіней, але ў радзе калгасаў не закончана будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў. У выніку апартуністычнай недацэнкі жывёлагадоўлі ў калгасе імя Сьвярдлова, Рагачэўскага раёну, 200 кароў не забясьпечаны належным памяшканьнем. У калгасе Дуброўка, гэтага-ж раёну, нічога ня зроблена па ўцяпленьні хлявоў.

Там, дзе вакол зімоўкі жывёлы арганізавана грамадзкая думка, там мы маем бальшавіцкія прыклады барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю. У радзе калгасаў Бабруйскага раёну догляд за каровамі і цялятамі пастаўлен на належную вышыню. У кароўніку ліквідавана абязьлічка, уведзена зьдзельшчына, паміж паасобнымі брыгадамі па догляду за жывёлай разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Трэба ўлічыць памылкі мінулага году і зьнішчыць тыя недахопы, праз якія мы мелі шмат страт у сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Трэба даць рашучы адпор кулацтву, якое вядзе шалёную агітацыю за зьнішчэньне жывёлы, за разбазарваньне кармоў. Шырокай мабілізацыяй калгасных мас, беднякоў і сераднякоў на пасьпяховае правядзеньне зімоўкі трэба дабіцца 100 процантнага захаваньня стада, 100 процантнага захаваньня маладняка.

У саўгасе імя Леніна разбазарваюцца кармы

ЕЛЬСК. (Наш кар.). У саўгасе імя Леніна знаходзіцца 400 галоў жывёлы. Кармы ў саўгасе выдаткоўваюцца нерацыянальна. Жывёлу кормяць брагай, але падача брагі ў хлявы не мэханізавана. Прыпанова рабочага Кахарчука аб падачы брагі праз трубы непасрэдна ў хлявы не праводзіцца ў жыцьцё.

Брага стаіць у чанах на дварэ, хто хоча той бярэ яе.

Подсьціл каровам не даецца ў дастатковай колькасьці. Торфу на подсьціл не загатоўлена. Саўгас ня ўжыў захадаў, каб поўнасьцю ўбраць усю сенажаць. Засталося ня скошанай 500 га балотнай сенажаці.

Гной у саўгасе не захоўваецца. Вадасточныя канавы не прыстасаваны, жыжка гніміцца, якая пры выкарыстаньні магла-б даць значную колькасьць добрага ўгнаеньня. Гной скідаюць у кучы на беразе сажалкі. Ёсьць небясьпека, што вясной, калі сьнег пачне раставаць, гной сплыве ў сажалку.

У гэтую справу павінны ўмяшацца органы пракуратуры.

Герасіменка.

Змагары за сацыялістычную жывёлагадоўлю

БЯРЭЗІНА. У калгасе «1 мая», К.-Борскага сельсавету, ёсьць 85 кароў і 41 цялят. Жывёлагадоўля пастаўлена на належную вышыню. Хлявы падрыхтаваны да зімы. Догляд за каровамі і цялятамі добры.

Лепшыя ўдарнікі па догляду кароў—гэта Таўнач Сьцяпан, 70-цігадовы дзядуля Карнацкі Мацьвей, Архіпец Цімох і Мурашка Мікіта.

Догляд за коньмі таксама добры. Коні стаяць у цёплай стайні.

Брыгада друку: Архіпец Васіль, Галубец Аляксей.

За зьнішчэньне цягавай сілы—да адказнасьці

Па Крупскім раёне наглядаюцца шматлікія выпадкі забою коняў. У калгасе ст. Дзянісавічы, Шынкаўскага сельсавету, старшыня калгасу загадаў забіць 2 капі.

У калгасе «Прэч саха», Шэйскага сельсавету, праўленьне калгасу прымусіла конюха выгнаць коняй са стайняў «на пашу» і не даваць ім корму. Коні блыталіся па вуліцы больш тыдню. Нарэшце, ад голаду і холаду адзін конь загінуў.

Кулацкія агенты павінны быць выключаны з калгасу і прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці за зьнішчэньне цягавай сілы.

Ударнік.

Пра арганізацыю камісій для правядзеньня аднаразовага вучоту жывёлы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Арганізаваць пры Дзяржпляне Камісію для правядзеньня аднаразовага вучоту жывёлы ў складзе тав. Кацэнельсона, З. Б. (Старшыня) і прадстаўнікоў ад Народнага Камісарыяту Земляробства, Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў пры СНК БССР і Народнага Камісарыяту Снабжэньня.

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і Менскаму, Віцебскаму і Гомельскаму гарадзкім саветам арганізаваць вучотныя камісіі ў складзе прадстаўнікоў раённага выканаўчага камітэту ці гарадзкога савету (старшыня), раённых (гарадзкіх) плянава - статыстычнай часткі, зямельнага аддзелу, інспэктара вайсковых спраў і інспэктара снабжэньня.

3. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы ўжыць захады да забесьпячэньня поўнага выкананьня праграмы вучоту жывёлы ў тэрміны, устаноўленыя Сэктарам народна - гаспадарчага вучоту Дзяржпляну.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

15 студзеня 1932 г.
гор. Менск, № 34.

Шэсьць умоў т. Сталіна ў дзеяньні

Бабруйск. Малочна таварная фэрма калгасаў «Камуніст», «Чырвоны Баец», «Луч Камуны» і інш. маюць сапраўдныя дасягненьні ў барацьбе за сацыялістычную жывёлагадоўлю і ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў т. Сталіна: Усе работы па доглядзе за жывёлай праводзяцца на аснове прэміяльнай зьдзельшчыны. Створаны сталыя брыгады, да якіх прымацавана пэўная колькасьць жывёлы. Паміж брыгадамі шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Вядзецца вучот выдаткаваньня кармоў. Кармовыя фонды перададзены пад адказнасьць і нагляд загадчыкам фэрм, кармы выдаюцца паводле вызначаных норм. (Белта).

Выканаць пляны камплектаваньня цялячых і сьвінагадоўчых фэрм

ГОМЕЛЬ. (Наш спэцкор). Гомельскі раён скончыў ўкамплектаваньне калгасных малочна-таварных фэрм.

Замест вызначаных плянам 14 фэрм арганізавана—19. У гэтых фэрмах ёсьць 1900 кароў (замест 1760 паводле пляну), што складае 107,9 проц. пляну.

Але побач з гэтымі дасягненьнямі ў справе камплектаваньня калгасных МТФ, Гомельскі раён мае значныя недахопы ў справе камплектаваньня калгасных цялячых і сьвінагадоўчых фэрм.

Плян камплектаваньня цялячых фэрм выкананы толькі на 65,5 проц. СТФ укамплектаваны на 45 проц., бо даўніцтва сьвінарнікаў выканана ўсяго толькі на 50 проц.

Для фарсаваньня будаўніцтва сьвінарнікаў райкалгасаюз арганізаваў і паслаў у калгасы міжкалгасныя брыгады цесьляроў у складзе 28 чал.

Аднак, гэтыя мерапрыемствы нельзя прызнаць дастатковымі. Неабходна прыняць больш рашучыя захады.

С. Громаў.

Загінула 80.000 цэглы

Нядбайнасьць на цагляным заводзе Менбуду

Цагельня Менбуду вырабляе 7 млн. штук цэглы ў год, і ў 1931 г. работа ішла да замаразкаў, па гэтай прычыне ў кантральках (памяшканьне, дзе сушыцца цэгла да адвозкі ў гофманскую печ) схапіла марозам 300 тыс. з лішнім штук цэглы-сырцу.

Быў складзен акт і зафіксавалі страту ў 300 тыс. з лішнім шт. цэглы—сырцу.

Хутка печ трэ' было загрузіць сырцом для новага абароту цэглы. Загрузілі ўсёй добрай цэглай, якая была на плянцох заводу, але не не хапала да поўнай загрузкі.

Па распараджэньні адміністратара т. Захаркевіча была дагружана астатняя нехапаючая колькасьць з забрака ванай, перамерзлай, цэглы. Такім чынам разам з добрай цэглай пайшла і дрэнная.

Рабочыя (цікава—усе як адзін) гаварылі, што «Нельга гэтага рабіць». Садчык адмаўляўся садзіць перамерзлую цэглу. Пальчык настолькі быў абураны, што ўзяўшы некалькі цаглін панёс адміністратару ў кантору, каб даць яму зразумець, што апальваць брак разам з добрай цэглай нельга.

Але «аўтарытэтам» адзінаначальля дырэктар заводу прымусіў рабочых рабіць тое, што ім загадаў Захаркевіч, і печ была нагружана гэтым бракам.

У выніку—загінула, паводле слоў адміністрацыі, 30.000 цэглы, а па даведках рабочых—да 80.000 шт. цэглы, якая магла-б пайсьці ў будоўлю. Толькі па віне «адміністратараў» Захаркевіча і Фрэліха страчана такая колькасьць цэглы.

Цяжка вызначыць, дзе тут нядбайнасьць, і дзе злоўжываньне.

Адміністрацыі трэсту, БРК Саюзу керамікаў і РБ ІТС керамікаў трэба ўнікнуць у гэту справу і даць належную ацэнку такім адносінам да савецкага заводу.

Цагельнік.

Адкрылася 2-я Менская гарадзкая партканфэрэнцыя і 10-я партканфэрэнцыя БВА

II гарадзкая канфэрэнцыя бальшавікоў Менску

15 студзеня, а 6 гадзіне ўвечары, адкрылася II канфэрэнцыя партарганізацыі гораду Менску. Адкрываючы канфэрэнцыю, сакратар Менгаркому КП(б)Б тав. Кавальчук падкрэсьліў гістарычную абстаноўку, у якой будзе праводзіць работу канфэрэнцыя.

— Канфэрэнцыя сабралася,—кажа тав. Кавальчук, — напярэдадні XIV усебеларускага зьезду партыі і ў момант уступленьня ў чацьвёрты заключны год пяцігодкі. Канфэрэнцыя павінна будзе падагуліць пройдзены шлях за мінулы год і намеціць канкрэтныя шляхі, якімі Менская партарганізацыя будзе ў далейшым, пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

Далей тав. Кавальчук у кароткіх рысах ахарактарызаваў работу, якую правёў Менскі гарадзкі камітэт КП(б)Б, адзначыў вялізарнейшыя дасягненьні як у прамысловасьці, так і ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ў культурным будаўніцтве, якія сталі магчымымі дзякуючы намаганьням усёй партарганізацыі па ажыцьцяўленьні 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, вядучы бязьлітасную барацьбу на два франту—супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, супроць «левых» эагібаў і прымірэнцтва да гэтых ухілаў; супроць розных ухілаў ад генэральнай лініі партыі ў нацыянальным пытаньні і супроць контрэвалюцыйнага трацкізму і яго кантрабанды.

Тав. Кавальчук спыніўся і на прарывах у рабоце арганізацыі, галоўным чынам, у галіне транспарту і ў выкананьні задач па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Тав. Кавальчук скончыў сваё уступнае слова, выказаўшы ўпэўненасьць у тым, што канфэрэнцыя пройдзе пры разгорнутай бальшавіцкай крытыцы і самакрытыцы, пад знакам яшчэ большага згуртаваньня навакол генэральнай лініі партыі, Цэнтральнага камітэту нашай партыі і праводыра тав. СТАЛІНА.

* * *

У склад прэзыдыуму канфэрэнцыі абрана 67 таварышоў, у ліку іх: тт. Гей, Шаранговіч, Галадзед, Калкін, Кавальчук, Убарэвіч, Аранштам, Матсон, Іваноў, Рыскін, Гантман, Шпэктараў, Чарвякоў, Кеніг, Чарнушэвіч, Гарын, Палякоў і інш. У склад сакратарыяту абрана 15 таварышоў, у мандатную камісію—13 таварышоў.

Пад бурныя воплескі ў ганаровы прэзыдыум абрана палітбюро ЦК Усе КП(б) і тт. Рудзутак, Тэльман, Ленскі і Корчык.

* * *

Канфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦО партыі «Правда» і гарадзкім партканфэрэнцыям Віцебску і Гомлю. Канфэрэнцыя абрала дэлегацыю для прывітаньня X партканфэрэнцыі БВО.

З рапартам перамог прыйшлі вітаць канфэрэнцыю бальшавікоў пралетары буйнейшых прадпрыемстваў гораду Менску: зав. «Бальшавік», імя тав. Варашылава і чыгункі. Ад імя чырвонаштандарнага «Бальшавіка» выступіў тав. Серабранскі. Ад заводу Варашылава—тав. Нортман і ад рабочых чыгункі—тав. Пайкоў.

Пад гукі аркестру і бурныя «ўра», у залю паседжаньня канфэрэнцыі ўвайшлі дэлегацыі байцоў і начскладу 2-ой Беларускай і 7-ай Самарскай дывізій. Вітаўшыя таварышы, рапартавалі канфэрэнцыі аб сваёй гатоўнасьці па першаму закліку партыі і ўраду выступіць на абарону заваёў Кастрычніка і завярэлі, што і надалей застануцца вернымі словам правадыра партыі і рабочае клясы тав. Сталіна: —«Чужой зямлі ня хочам, але і сваёй ні пядзі нікому не аддамо».

Ад імя канфэрэнцыі адказваў выступаўшы намесьнік старшыні СНК БССР тав. Бэнэк.

* * *

Са справаздачным дакладам ЦК КП(б)Б выступіў сакратар ЦК тав. Гей.

* * *

На ранішнім паседжаньні 16-і канфэрэнцыя заслухала працяг дакладу тав. Гея і даклад старшыні ЦКК-НК РСІ тав. Калніна. Спрэчкі па дакладах ЦК і ЦКК разгарнуліся на вячэрнім паседжаньні.

На X партканфэрэнцыі БВА

15 студзеня, а 6 гадзіне ўвечары, у клюбе жарчавікоў, адкрылася X партыйная канфэрэнцыя БВА.

Начальнік ПУАКР тав. Аранштам, адкрываючы партыйную канфэрэнцыю, каротка спыніўся на характарыстыцы таго пэрыяду, які прайшоў ад IX да X партыйнай канфэрэнцыі.

Наша канфэрэнцыя,—кажа тав. Аранштам,—адкрываецца ў такі час, калі рабочая кляса нашай краіны, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пасьпяхова скончыўшы трэці рашаючы год пяцігодкі, канчаткова вырашыла пытаньне—«хто каго» на карысьць сацыялізму. Посьпехі ў галіне індустрыялізацыі нашай краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ёсьць аснова для ўмацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны, для ўмацаваньня баяздольнасьці Чырвонай арміі.

Тав. Аранштам завастрае ўвагу дэлегатаў на выкананьні ленінскіх заветаў, аб узмацненьні Чырвонай арміі, яе баяздольнасьці, на задачах камуністаў работнікаў Чырвонай арміі.

Канфэрэнцыя абрала прэзыдыум у складзе 35 асоб, у тым ліку тт. Гей, Шаранговіч, Убарэвіч, Румянцаў, Аранштам, Галадзед і Калнін. Канфэрэнцыя абрала дэлегацыю для прывітаньня Менскай гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі, а таксама паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК Усе КП(б), ПУР, ЦК КП(б)Б, Абласткому Заходняй вобласьці, Смаленскай, Гомельскай і Віцебскай партыйным канфэрэнцыям.

З вялікім дакладам аб рабоце ПУАКРУ выступіў тав. Аранштам.

16 студзеня канфэрэнцыя заслухала даклад кам. БВА тав. Убарэвіча, пасьля чаго пачаліся спрэчкі па дакладах.

Сэкцыя РСІ Гомгарсавету—у барацьбе за месца ў „Чырвонай кнізе"

Сэкцыя РСІ Гомельскага гарсавету змагаючыся за выкананьне праграмы-мінімуму шырока разгарнула масавую работу. Маючы ў часе арганізацыі склад у 32 чалавек, сэкцыя зараз пашырыла свае рады да 180 членаў.

Як відаць з рапарту, які сэкцыя РСІ Гомельскага гарсавету дасла «Савецкай Беларусі», за апошнія месяцы сэкцыяй праведзена шмат работы. Разам з будаўнічай сэкцыяй, яна правяла абсьледваньне пабудовы Гомельскага элеватара. У гэтае абсьледваньне была ўцягнута шырокая рабочая грамадзкасьць. Сэкцыя абсьледвала становішча справы палітэхнізацыі гомельскіх школ, праверыла выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб дашкольным выхаваньні. Па гэтых галінах сэкцыяй выяўлена рад недахопаў і дана рад прапаноў, якія зараз рэалізуюцца Гарсаветам і РКК-РСІ.

На працягу IV кварталу 1931 году сэкцыя РСІ праводзіла «паход за дзесяцьць рабселькораўскіх допісаў».

На заводзе «Рухавік Рэвалюцыі» паход выявіў недастатковае кіраўніцтва рабселькораўскім рухам з боку партарганізацыі, нядбайныя адносіны да справы рэагаваньня на рабселькораўскія допісы. Загадчык ФЗВ заводу проста пагражаў аднаму рабкору «Палескай Праўды», які выявіў некаторыя недахопы ФЗВ: «ты ня маеш права аб гэтым пісаць». Загадчык аднаго цэху зьбіраўся «выкінуць» чорную дошку, якую ўвяла рэдкалегія на сьцентгазэты.

На гарбарні заўкомаўцы разважалі такім чынам: «на допісы, якія датычацца да заўкому мы рэагуем, але што датычыцца адміністрацыі—гэта ня наша справа».

Вынікі паходу былі перададзены Рай. КК-РСІ, якая зрабіла з іх адпаведныя вывады, прыцягнуўшы да адказнасьці вінаватых у дрэнным рэагаваньні на рабкораўскія допісы.

Зараз сэкцыя РСІ перабудоўвае сваю работу ў напрамку арганізацыі сталых брыгад. З 25 сьнежня сэкцыя ўключылася ў конкурс абвешчаны ЦО «Правда» і разгортвае ў гэтым напрамку работу.

Ш.

Рэзалюцыя ЦК КПП

па пытаньні аб перамаганьні ідэалёгічнай спадчыны люксэмбургіянства ў КПП

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарскай революцыи» мае для ўсяго Камуністычнага Інтэрнацыяналу і асабліва для яго польскай сэкцыі—КПП—вялізарнае прынцыповае і практычнае значэньне.

Паставіўшы з усёй вострасьцю і высьветліўшы гістарычную ролю бальшавізму ў яго непрымірымай прынцыповай барацьбе з усякага роду апартуністычнымі ўхіламі, тав. Сталін мабілізаваў і завастрыў пільнасьць камуністычных партый супроць трацкісцкай кантрабанды, рэвізіі асноўных прынцыпаў ленінізму і лібэральных прымірэнцкіх адносін да чужых і варожых ленінізму поглядаў. Як трацкісцкія, так і брандлерыянскія рэнегаты камунізму для барацьбы супроць Камуністычнага Інтэрнацыяналу карыстаюцца зброяй з арсэналу люксэмбургізма.

КПП, як пераемніца традыцый СДП і Л, павінна праявіць выключную пільнасьць да ўсякіх спроб абароны або паўтарэньня памылак люксэмбургіянства і правесьці грунтоўную пасьлядоўную ленінскую самакрытыку ідэалёгічнай спадчыны люксэмбургіянства.

У вядомай крытыцы брашуры Юніуса (Р. Люксэмбург) Ленін падкрэсьліваў неабходнасьць «самакрытыкі і ўсебаковай праверкі поглядаў, якія (самакрытыка і праверка) павінны паслужыць ідэйнай базай для 3-га Інтэрнацыяналу».

СДП і Л—найбольш тыповая прадстаўніцтва люксэмбургізма ў II Інтэрнацыянале—у важнейшых асноўных праблемах пралетарскай рэвалюцыі, і перш за ўсё ў пытаньні аб перарастаньні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, у нацыянальным пытаньні, у сялянскім пытаньні, у арганізацыйным пытаньні, займала памылковую пазіцыю і процістаўляла яе бальшавізму, які ўжо ў 1903—1905 г.г. аформіўся, як адзіны сапраўды марксысцкі напрамак у II Інтэрнацыянале, які праводзіў не прымірымае і пасьлядоўнае змаганьне з апартунізмам як на Захадзе, так і ў Расіі.

Таму выказаны на 3-м зьезьдзе КПП погляд, быццам-бы СДП і Л была польскай відазьменай бальшавізму, а розьніца паміж ёю і бальшавікамі знаходзілася ў межах бальшавізму, зьяўляецца памылковым. Гэты погляд затрудняе разуменьне і перамаганьне памылак люксэмбургізма.

Вузлавым пунктам памылак СДП і Л зьяўляюцца няправільныя, небальшавіцкія адносіны да пытаньня аб уладзе і рухомых сілах рэволюцыі.

Люксэмбургізма адмаўляла ленінскую тэорыю дыктатуры пралетарыяту і адзіна правільную ленінскую канцэпцыю перарастаньня буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную рэвалюцыю пралетарыяту, процістаўляла па сутнасьці паўменшавіцкую схэму «пэрманэнтнай рэвалюцыі», якая высоўвалася таксама і Троцкім. У сувязі з гэтым СДП і Л не прызнавала адзіна правільнага ва ўмовах буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі лёзунгу рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пралетарыяту і сялянства.

З памылковых адносін да пытаньня аб рэвалюцыйнай дыктатуры выцякала і тое, што СДП і Л у 1905 годзе адхіляла саветы рабочых дэпутатаў, якія ўжо тады складалі зачаткі рэвалюцыйнай улады, а таксама пазьнейшыя апартуністычныя памылкі Розы Люксэмбург, крытыкуючай бальшавікоў і савецкую ўладу за разгон Устаноўчага сходу, ужываньне рэвалюцыйнага тэрору і г. д.

Чужым быў СДП і Л ленінскі прынцып гегемоніі пралетарыяту ў вызваленчай барацьбе ўсіх прыгнечаных, раней усяго сялянства і прыгнечаных нацый. У сувязі з гэтым СДП і Л адхіляла ленінскі прынцып рабоча-сялянскага саюзу і ўпарта змагалася супроць лёзунгу самавызначэньня, які мабілізуе на барацьбу з імпэрыялізмам самыя шырокія масы прыгнечаных і падняволеных нацый. Памылковы погляд на нацыянальнае пытаньне перашкаджаў СДП і Л (абедзьвюм фракцыям яе: «зажондовцам» і «разломовцам») весьці пасьлядоўную барацьбу з імпэрыялізмам, у асаблівасьці ў перыяд імпэрыялістычнай вайны (адносіны да нацыянальных войнаў, да паўстаньняў, да ірляндзкага паўстаньня і г. д.).

Мэханічна абумоўліваючы разьвіцьцё і заняпад капіталізму ад замежных рынкаў, Роза Люксэмбург дала памылковую паўменшавіцкую тэорыю імпэрыялізму, якая адрывае імпэрыялізм ад яго самых асноўных рысаў (манапалістычнае загніваньне капіталізму, панаваньне фінансавага капіталу). Роза Люксэмбург разьвіла апартуністычную тэорыю аўтаматычнага краху капіталізму, які зьяўляецца вынікам вычэрпваньня некапіталістычных рынкаў збыту, тэорыю, якая яўна пярэчыць маркасысцка-ленінскай тэорыі, выходзячай з разьвіцьця ўнутраных супярэчнасьцяй капіталізму, якія зна ходзяць сваё вырашэньне ў сацыялістычнай пралетарскай рэвалюцыі.

Мэханічны падыход да працэсу капіталістычнага разьвіцьця зьяўляўся таксама асновай так званай «тэорыі арганічнага ўрастаньня». Правільна падкрэсьліваючы, што прамысловасьць б. царства польскага вырасла ў сувязі са збытам на расійскіх рынках, што такім чынам, побач з барацьбой супроць рэвалюцыйнанага руху, эканамічныя інтарэсы польскай буржуазіі зьвязвалі яе з царызмам, Роза Люксэмбург схематычна адсюль рабіла вывад аб поўным зьліцьці гаспадарчых сыстэм Расіі і царства польскага ў адно непарыўнае цэлае, аб поўным зьліцьці польскіх пануючых клясаў з расійскімі. Роза Люксэмбург ня бачыла, што ў імпэрыялістычнай дзяржаве ўлада знаходзіцца раней усяго ў руках кіруючых клясаў пануючай народнасьці і недаацэньвала антаганізму паміж даволі высокай ступенью капіталістычнага разьвіцьця царства польскага і дзяржаўнай формай царызму.

Памылковая люксэмбургіянская пазіцыя СДП і Л у нацыянальным пытаньні перашкаджала пралетарыяту Польшчы адыграць ролю гегемона ў адносінах да шырокіх мас дробнай буржуазіі і сялянства, больш таго, затрудняла партыі барацьбу з ушывам дробна-буржуазнага сацыял-патрыятызму ППС на рабочыя масы.

З гэтай мэханічнай устаноўкі ў пытаньні аб заняпадзе капіталізму вынікала тое, што люксэмбургіянства перапавялічвала ролю стыхійнасьці ў рэвалюцыі і памяншала ролю суб'ектыўнага фактару, змагалася з бальшавіцкімі прынцыпамі пабудовы партыйнай арганізацыі, лічачы іх блянкізмам, адмаўляла ленінскае вучэньне аб партыі, як арганізатара рэвалюцыі і арганізатара ўзброенага паўстаньня. Адсюль чужая рэвалюцыйнаму марксызму люксэмбургіянская тэорыя стыхійнасьці, «арганізацыі, як працэсу». Праяўленьнем гэтай памылковай пазіцыі СДП і Л у пытаньні аб масавых арганізацыях пралетарыяту—зьяўляюцца сэктанцкія адносіны да профсаюзаў, якія разглядаюцца як прыдатак да партыі.

Па пытаньні расколу паміж бальшавізмам і меншавізмам разам з яго трацкісцкай разнавіднасьцю галоўнае кіраўніцтва СДП і Л займала прымірэнцкую і цэнтрысцкую пазіцыю, ува ходзячы ня раз у блёк з меншавікамі і трацкістамі супроць бальшавікоў (Брусэльская канфэрэнцыя).

Люксэмбургіянства, складаючы дак трыну зусім выкрышталізаваную і якая моцна ўкаранілася сярод польскіх рэвалюцыянэраў, доўга яшчэ пасьля ўзьнікненьня КПП зьяўлялася афіцыяльнай ідэалёгіяй партыі і побач з пагубнымі меншавіцкімі традыцыямі лявіцы ППС зьяўлялася сур'ёзнай перашкодай у пераходзе партыі на пазіцыі ленінізму. У практыцы люксэмбургіянская дактрына цяжка адбілася на лёсе пралетарскай рэвалюцыі ў імпэрыялістычнай паваенній Польшчы, прыгнятаючай заваяваныя народнасьці. Памылковая люксэмбургіянская дактрына на працягу доўгага часу не давала нашай партыі разьвіць бальшавіцкую пралетарскую стратэгію: заваяваць рэвалюцыйных саюзьнікаў у асобе сялянскіх і працоўных мас, закабаленых народнасьцяй для пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі (1918, 1920, 1923 г.).

Афіцыяльны разрыў з люксэмбургізмам наступіў толькі на 2-м зьезьдзе КПП у 1923 годзе. Але тагочасная кіруючая група партыі з т.т. Варскім і Кастшэвай на чале правяла эклектычную апартуністычную крытыку люксэмбургізма, не праводзячы ні ў той час, ні пазьней рэвізіі меншавіцкай ідэалёгіі і спадчыны лявіцы ППС, правая група т.т. Варскага і Кастшэвы прыняла толькі «праграмныя лёзунгі бальшавізму, але ня здолела і, як пазьней аказалася, не хацела выхаваць партыі ў духу бальшавіцкай рэвалюцыйнай тактыкі, якая толькі здольна правесьці ў жыцьцё лёзунгі камуністычнай праграмы» (з ліста Выканкому КІ). Невыпадковым было з боку правай верхавіны Варскага—Кастшэвы падтрыманьне групы Брандлера ў брацкай нямецкай партыі і падтрыманьне апазіцыі Троцкага супроць бальшавіцкага ЦК УсеКП(б) у цяжкі момант пасьля сьмерці Леніна.

Доўга абараняла люксэмбургіянскія пазіцыі ультра-левая плынь (Гэкэр, Домскі), упарта змагаючыся з ленінскай лініяй Камінтэрну і бальшавізацыяй нашай партыі. Плынь гэта з часам ператварылася ў польскую разнавіднасьць трацкізму.

Кіруючыя кадры КПП не правялі пасьлядоўнай ленінскай крытыкі люксэмбургізма, а значная частка кадраў СДП і Л у Савецкім саюзе заглядалася на рэвалюцыйныя традыцыі СДП і Л, упарта абараняла памылкі люксэмбургізма.

Абарона памылак люксэмбургіянства яркa выкрылася яшчэ два гады таму назад у артыкуле тав. Малеўскага, погляды якога ў агульным ідуць па лініі поглядаў, выказаных Слуцкім.

Памылкі люксэмбургіянства каранілісь таксама ў пазіцыі СДП і Л у адносінах да Берасьцейскага міру і ў пераходзе асноўных кадраў СДП і Л у Савецкай Расіі на пазіцыі так званага «левага камунізму».

Цяжкія вопыты мінулых баёў зьвярнулі ўвагу ўсёй партыі на глыбокія ідэалёгічныя крыніцы дапушчаных памылак, паскараючы працэс бальшавізацыі нашай партыі. Сур'ёзныя дасягненьні КПП у сялянскім і нацыянальна-вызваленчым руху, узрастаючая самастойная роля партыі ў штодзённай забастовачнай барацьбе пралетарыяту, рост партыйных арганізацый, ня гледзячы на ўзмацненьне тэрору фашысцкай дыктатуры, дасягненьні партыі ў ідэалёгічнай галіне—ў барацьбе на два фронты—вось вынікі прагрэсуючай бальшавізацыі партыйных радоў.

Ажыцьцяўленьне галоўнай задачы сучаснага моманту: заваяваньне большасьці пралетарыяту, а пад яго гегемоніяй заваяваньне асноўных працоўных мас сялянства і прыгнечаных народаў, арганізацыя пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы—патрабуе бальшавіцкага перамаганьня ідэалёгічнай спадчыны люксэмбургізма.

У гэтых адносінах дырэктыва V-га зьезду КПП аб «давядзеньні да канца рэвізіі люксэмбургізма ў духу ленінскіх установак у асноўных праблемах рэвалюцыі» стаіць ва ўсёй шырыні перад партыяй. Гістарычныя заслугі СДП і Л у барацьбе з нацыяналізмам, у інтэрнацыянальным выхаваньні польскага пралетарыяту, у брацкім яднаньні польскіх і расійскіх рабочых, кіруючая роля СДП і Л у рэвалюцыі 1905 году ў царстве польскім, а таксама той факт, што з усіх партый II Інтэрнацыяналу яна была самай блізкай бальшавіком і з самага пачатку стала ў рады рэвалюцыі 1917 г.—усё гэта ўскладае на КПП тым больш абавязкі правядзеньня грунтоўнай рэвізіі люксэмбургізма.

Перажыткі люксэмбургізма, якія выкрываюцца яшчэ і зараз у практыцы КПП, знаходзяць сваё адлюстраваньне ў недаацэнцы штодзённай барацьбы ў нацыянальна-вызваленчым руху, у супраціўленьні паасобных зьвеньняў партыі ажыцьцяўленьню пералому ў галіне нацыянальна-вызваленчай барацьбы, у хвасьцізкіх тэндэнцыях і ў недаацэнцы арганізацыйных задач і г. д.

Крытыка люксэмбургізма павінна зрабіцца асноўным фактарам бальшавізацыі ўсёй партыйнай практыкі як у тактычнай, так і ў арганізацыйнай галіне. Грунтоўная крытыка люксэмбургізма дапаможа партыі перамагчы адставаньне ад нарастаючых рэвалюцыйных падзей, узьніме ролю партыі, як ініцыятара і арганізатара ў рэвалюцыйным руху, забясьпечыць партыю ад недаацэнкі партыйнай сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, дасьць магчымасьць пашырыць і ўмацаваць арганізацыйны ахоп партыі.

Выходзячы з гэтых установак, ЦК КПП лічыць неабходным:

1. Крытычнае асьвятленьне асобных бакоў люксэмбургізма, а таксама ідэалёгіі СДП і Л (тэорыя накапленьня капіталу, тэорыя «пэрманэнтнай рэвалюцыі», аграрнае пытаньне, нацыянальнае пытаньне, прынцыпы тактыкі і арганізацыі і г. д.).

2. Далейшую крытыку апартуністычных, эклектычных адносін да люксэмбургізма, бязьлітасную барацьбу з кантрабандай люксэмбургіянскіх поглядаў у партыйных выданьнях і з прымірэнчымі адносінамі да гэтых поглядаў; праверку і крытычны прагляд выданьняў у галіне гісторыі партыі і рабочага руху ў Польшчы, далейшае высьвятленьне ролі меншавіцкіх тэндэнцый ППС лявіцы, як адной з перашкод да бальшавізацыі партыі.

3. Паскарэньне распрацоўкі праграмы партыі для фармулёўкі і ўмацаваньня ленінскіх асноў партыйнай ідэалёгіі.

4. Паглыбленьне ленінскага выхаваньня партыі шляхам выданьня асноўных твораў Леніна, а таксама раду прац з галіны марксысцка-ленінскай ідэалёгіі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Барацьба за лён

Галавацяпы з Магілеўскага Саюзтрансу

згнаілі вагон лёнавалакна

„Вагон экспартнага валакна выкінулі на вецер“

МАГІЛЕЎ. Загатоўчыя арганізацыі Магілеўшчыны ня могуць пахвастацца вялікімі посьпехамі ў галіне загатовак лёна-валакна. Плян па валакну на 10 студзеня выканан толькі на 16 проц. Яшчэ горш абстаіць справа з якасьцю валакна. Валакно далёка не адпавядае стандартызацыі, лён дрэнна апрацаваны, гэтаму пытаньню не надаецца належнай увагі з боку загатоўчых арганізацый.

Некаторыя арганізацыі злачынна нядбайна адносяцца да захаваньня за гатоўленай прадукцыі. Па віне Саюзтрансу сапсаваны вагон высокаякаснага валакна.

Пасьля доўгіх клапатлівых работ Магілеву ўдалося сабраць вагон лёна-валакна. Тавар быў добрай якасьці, належна апрацаваны, яго мелася накіраваць на экспарт. Але ён быў перададзен Саюзтрансу, які пратрымаў яго ў сябе 5 дзён, паскідаў яго на платформу, дзе стаялі цэлыя лужы вады. Пасьля пяцідзённага прабыцьця лёну ў такім становішчы ён падмок і зусім страціў ня толькі сваё экспартнае значэньне, але яго нават нельга выкарыстаць на мясцовай прамысловасьці.

Справа перададзена пракуратуры. Але мы лічым гэта недастатковым. Трэба мабілізаваць усю грамадзкую думку вакол гэтага абураючага выпадку, трэба моцна ўдарыць па галавацяпству работнікаў з Саюзтрансу, якія сваімі нядбайнымі адносінамі зусім сапсавалі высокакаштоўны тавар. Гэты выпадак яшчэ раз сьцьвярджае, што да гэтага часу на мясцох загатоўчыя арганізацыі не завастрылі ўвагі на якасьць прадукцыі.

Мы патрабуем ад Магілеўскай пракуратуры прыняць суровыя захады супроць тых, якія зрываюць плян лёназагатовак.

Л. Ар.

Ударнікі лёназагатовак прэміяваны

Ворша, (наш кар.). Рад калгасаў Аршаншчыны ўжо поўнасьцю выканалі пляны лёназагатовак. Прэзыдыум Райвыканкому пастанавіў прэміяваць гэтыя калгасы, а таксама прэміяваць і тых работнікаў і калгасьнікаў, якія сваім непасрэдным удзелам садзейнічалі пасьпяховаму разгортваньню ільназагатовак і іх выкананьню.

Вось гэтыя ўдарнікі лёназагатовак атрымаўшыя прэміі.

Калгас Імя Сталіна, Дубраўскага сельсавету—атрымаў прэмію—швэйную машыну, праўленьне калгасу атрымала грашыма 100 руб., брыгада калгасьнікаў, якая прымала ўдзел у апрацоўцы лёну—грашыма 200 руб.

Калгас «Шлях да Сацыялізму», Рудкаўскага сельсавету — атрымаў трактар, праўленьне калгасу—100 р., брыгада—200 руб.

Калгас «Красуліна», Якаўлевіцкага сельсавету — пасьцяльную мялку, праўленьне калгасу 50 руб., брыгада —100 руб.

Калгас «Працаўнік», Якаўлевіцкага сельсавету — машыну Гільштойна, праўленьне 50 руб., брыгада—100 р.

За добрае выкананьне плянаў загатовак лёнавалакна і за масавую работу ў час загатовак, за арганізацыю загатовак і падрыхтоўку да іх, прэміяваны работнікі сельсаветаў: Рудкаўскага—старшыня сельсавету Шчураў —100 руб., сакратар—Дзяржыцкі—50 руб., сакратар кандыдацкай групы —100 руб., Якаўлевіцкага сельсавету —старшыня т. Тысянка—100 р., сакратар Малодчанка—50 руб., сакратар партыйнай ячэйкі т. Лавянецкі—100 руб. і старшыня Сельспажыўтаварыства—у 100 руб.

Усім калгасам, якія да гэтага часу яшчэ ня выканалі пляны лёназагатовак, патрэбна ўзяць прыклад з ударнікаў-змагароў за лён. Яны павінны дабіцца на працягу самага бліжэйшага часу выкананьня і перавыкананьня плянаў загатовак, каб атрымаць магчымасьць рапартаваць XIV зьезду КП(б)Б аб перамозе.

А. С.

Бярэце прыклад з калгасу „Полымя Рэвалюцыі“

Калгас «Полымя Рэвалюцыі», Дубраўскага сельсавету, Крупскага раёну, пасьпяхова скончыў апрацоўку лёну. Калгас арганізаваў чырвоны абоз і здаў (прадаў) дзяржаве 1.020 кг. валакна і 1.600 кг. семя. Лёнавалакно апрацавана добрай якасьці.

Гэтых посьпехаў калгас дамогся халкуючы таму, што апрацоўка лёну праводзілася па ўдарнаму, што была ўведзена зьдельна - прагрэсыўная аплата працы.

Райкалгасаюз прэміраваў калгас «Полымя Рэвалюцыі» ў 100 рублёў за ўдарнае правядзеньне апрацоўкі і здачы лёну.

Аляксяёнак.

Вушаччына не разгарнула лёназагатовак

Прагрэсыўна-прэміяльная зьдзельшчына ня ўведзена

ВУШАЧЫ. Крывая тэмпаў загатовак лёну па Вушацкім раёне вельмі ньіжаецца. Калі пяцідзёнка з 30 лістапада па 5 сьнежня дала выкананьне плану 5-6 проц., дык пяцідзёнкі з 25 сьнежня па 5 студзеня далі выкананьне плану на 1,5 проц. Агульнараённы плян па лёна-валакну выкананы ледзь на 44,3 проц.

Вялікім тормазам у ходзе лёназагатовак—гэта слабая работа загатоўчых арганізацый і лёнапрацоўчых пунктаў. Райкалгасаюз не забясьпечыў правядзеньня апрацоўкі лёну на калгасах на аснове прагрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны. (Белта).

Рэалізаваць адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб новых умовах гаспадарчага разьліку

Калегія Наркамфіну і кіраўніцтва Усебелканторы Дзяржбанку заслухалі даклад аб вынніках абсьледваньня фінансавай дзейнасьці Лесбелу, спажывецкай кааперацыі і прамкааперацыі.

Адзначана, што праўленьні Белкаапсаюзу, Белкаапрамсаюзу і кіраўніцтва Лесбелу ў значнай ступені не рэалізавалі адозву ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу аб новых умовах гаспадарчага разьліку. Не праведзена належных мерапрыемстваў па пераводзе на гаспадарчы разьлік баз, буйных магазынаў спажыўкааперацыі, найбольш моцных прамарцеляў і лесвучасткаў.

Ніводная з пералічаных сыстэм не паставіла на належную вышыню работу па фінансавым плянаваньні і апэрацыйны кантроль за выкананьнем фінплану.

У выніку гэтага арганізаваныя галіны аб'яднаньні Белкаапсаюзу і Белкаапрамсаюзу канчаткова не аформлены, разьдзел балянсаў ня вытвораны, унутрысыстэмныя разьлікі заблытаны.

Зусім нездавальняюча выконваюцца якасныя паказальнікі крам і гандль-фінплянаў. Заданьне па зьніжэньні сабекошту, за мінулы час, ня толькі ня выконваецца, але сабекошт мае тэндэнцыю да падвышэньня. У сувязі з гэтым страты дасягаюць вялізарнейшых памераў (пазодле арыентавальнага балянсу Лесбелу на 1-X-31 г. —26 млн. руб.)

Такое становішча ў галіне сабекошту ставіць вызначаныя ўласныя зваротныя сродкі пад пагрозу «праяданьня» (па Лесбелу) і не забясьпечвае фармаваньне ўласных зваротных сродкаў, па спажывецкай і прамысловай кааперацыях.

Нездавальняючая пастаноўка справы фінансавага плянаваньня, адсутнасьць апэрацыйнага кантролю ходу выкананьня дагавароў, незакончанасьць унутрысыстэмных разьлікаў і вельмі частае незнаёмства з асноўнымі палажэньнямі аб крэдытнай рабоце,—прыводзіць да ўкараненьня ў практыку работы гаспадарчых арганізацый элемэнтаў камэрцыйнага крэдытаваньня і простага тавараабмену.

У мэтах укараненьня гаспадарчага разьліку па ўсіх зьвеньях лясной прамысловасьці, спажывецкай і лясной кааперацыі, прызнана неабходным перавесьці на гаспадарчы разьлік не пазьней 1-II-32 г. ня менш 60 проц. усіх лесазучасткаў па лесвоенгасах, усіх баз найбольш буйных магазынаў спажсыстэмы, зварот якіх дасягае 80--90 тыс. р., а таксама больш буйных арцеляў прамкааперацыі.

Прапанавана ўсім раённым і гарадзкім фінансавым аддзелам на працягу бліжэйшых 2 х дэкад пракерыць усю работу па мабілізацыі, унутраных рэсурсаў па леспрамгасах, спажывецкай і прамысловай кааперацыі, прыцягнуўшы да абмеркаваньня ініцыятыў у зрыве гэтай работы.

Усебелканторы Дзяржбанку даручаюць разгарнуць самую рашучую барацьбу супроць праяўленьняў камэрцыйнага крэдытаваньня.

Раённыя і гарадзкія фінансавыя аддзелы павінны неадкладна перабудзіць сваю работу, арганізаваць сыстэматычны нагляд за ходам работ па ўкараненьні гаспадарчага разьліку і выкананьня народна-гаспадарчага плану.

(Белта).

Лепшыя ўдарнікі фінансавага фронту—прэміяваны

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту фінансаў БССР аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу 1931 году

г. Менск, 14 студзеня 1932 г.

Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка, яе фінансава - крэдытныя органы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Беларусі, пры актыўным удзеле шырокіх рабочых і калгасных мас і грамадзкіх арганізацый, на грунце рашучай барацьбы з правымі і «левымі» апартуністамі, разгорнутай масавай работы, правядзеньня фінансавай эстафэты, усебеларуская га зьлёту ўдарнікаў фінансавай работы дамагліся значных перамог на фінансавым фронце, цалкам выканаўшы плян мабілізацыі сродкаў IV кварталу (101,7 проц.), што вызначыла і пасьпяховыя вынікі выкананьня гадовага пляну мабілізацыі сродкаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі (101,5).

Гарады і раёны — Менскі, Віцебскі, Гомельскі, Сіроцінскі, Жыткавіцкі, Заслаўскі, Сеньненскі, Касьцюковіцкі, Асіпавіцкі і Магілеўскі паказалі прыклады сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за справу выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, за ўмацаваньне фінансавай базы сацыялістычнага будаўніцтва, на працягу ўсяго кварталу ішлі баявымі тэмпамі і значна перавы канналі плян IV кварталу.

Раёны — Хойніцкі, Мсьціслаўскі, Церахаўскі, Горацкі, Лёзьненскі, Лепельскі, Парыцкі, Плешчаніцкі; Бабруйскі, Полацкі, Лельчыцкі і Дрысенскі таксама дасягнулі значных посьпехаў і амаль, што цалкам выканалі кварталь ны плян.

Побач з гэтым рад раёнаў не ўявілі ўсёй важнасьці фінансавай справы, не пераключыліся на новыя формы і мэтады работы, не забясьпечылі шырокай арганізацыйна - масавай работы; мазочы зусім рэальныя да выкананьня заданьні з кварталу ў квартал, з дэкады ў дэкаду недавыконвалі плянаў, не забясьпечылі належнага пералому і ў IV квартале і сваімі апартуністычнымі тэмпамі ўвесь час зьніжалі агульна-рэспубліканскія вынікі выкананьня пляну.

Выходзячы з вынікаў выкананьня пляну IV кварталу і ўсяго мінулага 1931 г., Калегія Народнага камісарыяту фінансаў БССР пастанаўляе:

1. За выдатную, энэргічную работу на фронце мабілізацыі сродкаў і значнае перавыкананьне пляну IV кварталу занесьці на чырвоную дошку наступныя раёны: Менскі, Віцебскі, Гомельскі, Сіроцінскі, Жыткавіцкі, Заслаўскі, Сеньненскі, Касьцюковіцкі, Асіпавіцкі, Магілеўскі.

2. Адзначыць, што Народным камісарыятам фінансаў СССР прэм'яваны Менскі гарфа ў 5.000 руб., Гомельскі гарфа — 5.000 руб. і Саветам народных камісараў БССР Менскі гарсавет у суме 30.000 руб. на арганізацыю дзіцячых ясьлей для дзяцей рабочых і 3.000 руб. на прэм'яваньне пасабных ударнікаў фінансавага фронту.

Выдаць у распараджэньне загадчыкаў гарфа і райфа ніжэйпаказаных раёнаў і гарадоў на прэм'яваньне пасабных лепшых ударнікаў фінансавага фронту:

Загадчыка Віцебскага гарфа т. Адама—5.000 руб.

Загадчыка Гомельскага гарфа тав. Карпмана—2.000 руб.

Загадчыка Сіроцінскага райфа Яшкіна — 1.000 руб.

Загадчыка Жыткавіцкага райфа Русанава — 1000 руб.

Загадчыка Заслаўскага райфа тав. Бермана — 1.000 руб:

Загадчыка Сеньненскага райфа тав. Бондараева — 1000 руб.

Загадчыка Касьцюковіцкага райфа тав. Адаменка — 1000 руб.

Загадчыка Асіпавіцкага райфа тав. Перавозьнікава — 1000 руб.

Загадчыка Магілеўскага райфа тав: Катковіча — 1.500 руб.

Загадчыка Хойніцкага райфа тав: Ізашчэнка — 750 руб.

Загадчыка Мсьціслаўскага райфа т. Буласава — 750 руб.

Загадчыка Церахаўскага райфа тав: Лупанава — 750 руб.

Загадчыка Горацкага райфа тав. Гафта — 750 руб.

Загачыка Лёзьненскага райфа тав. Аронава — 750 руб.

Загадчыка Лепельскага райфа тав. Шафрана — 750 руб.

Загадчыка Дуброўенскага райфа т. Філіпава — 500 руб.

3. У адпаведнасьці з пастановай Першага ўсебеларускага зьлёту ўдарнікаў фінансавага фронту пакінуць на чорнай дошцы да належнага пералому ў рабоце па мабілізацыі сродкаў раёны: Расонскі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Узаравіцкі, Чырвонапольскі; Чэрвеньскі, Сураскі і дадаткова занесьці на чорную дошку раёны: Вушацкі, Глускі, Узьдзенскі, Гарадоцкі, Рагачэўскі і Кармянскі.

Катэгарычна паказаць з папярэджаньнем загадчыкам райфа названых раёнаў на абсалютную недапушчальнасьць мазочэньня ў гэтых раёнах апартуністычнага становішча па справе мабілізацыі сродкаў. Адначасова ад значыць, як недапушчальнае зьявішча, што адстаючыя раёны па мабілізацыі сродкаў не прадставілі ў НКФін сьпісу ўдарнікаў фінработы для прэм'яваньня.

4. За асабліва выдатную работу, энэргію, энтузіязм праяўленыя ў рабоце па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу прэм'яваць наступныя прадпрыемствы, арганізацыі і пасобных актывістаў фінансавай работы.

1. Калектыў Гомсельмашу на арганізацыю дзіцячай пляцоўкі для дзяцей рабочых заводу — 1.000 руб.

2. Рэдакцыю газэты «Віцебскі пралетары» для прэм'яваньня работнікаў рэдакцыі і лепшых ударнікаў фінкораў —500 руб.

3. У распараджэньне кіраўніцтва (трыкутніка) Магілеўскай шоўкавай фабрыкі імя тав: Куйбышава для прэм'яваньня лепшых ударнікаў - брыгадзіраў ліквідацыі фінансавага прарыву па гэтай фабрыцы — 400 руб:

5. Барысаўскі раённы камітэт Чырвонага Крыжа за актыўную работу па рэалізацыі пазыкі і мабілізацыі сродкаў — 300 руб.

6. Смалявіцкі сельсавет для прэм'яваньня лепшых ударнікаў фінансавага фронту — 500 руб.

7. Узьняць хадайніцтва перад НКФ СССР аб узнагародзе з выдачай ім ганаровага жэтону ўдарніка фінансавага фронту — тт.

а) Алейнікава Н А, кіраўніка сэктару масавых плацяжоў, масавай работы і мабілізацыі сродкаў НКФ БССР.

б) Кайкога, старшыні ЦП прафсаюзаў фінбанкаўскіх работнікаў.

в) Добрына, загадчыка Менскага гарфа.

г) Адама, загадчыка Віцебскага гарфа.

д) Карпмана, загадчыка Гомельскага гарфа:

е) Каркачова, загадчыка агіт-масавым сэктарам Менскага ГК КП(б)Б.

ж) Ражноўскага, старшыню Сіроцінскага РВК.

з) Кудзельскага, сакратара Заслаўскага РК КП(б)Б.

і) Нядольнага, рабочага - ударніка Гомельскага заводу «Пралетары».

к) Бабіцкага, загадчыка Віцебскай касы ашчаднасьці.

8: Прэм'яваць па пэрсанальным сьпісе (загадам па Наркамаце) ударнікаў фінансавай работы гарадзкіх, раённых сельскіх фінансава - крэдытных органаў, грамадзкіх арганізацый, рабочых, калгасьнікаў, настаўнікаў, лётаносцаў, пінэраў у суме 6.250 руб.

Апроч таго прэм'яваць пэрсанальна:

а) Рабочага ўдарніка, заводу імя Варашылава, брыгадзіра НКФіну па ліквідацыі прарываў у Дуброўенскім раёне, сацыялістычнага намесьніка кіраўніка сэктару масавых плацяжоў НКФ БССР тав. Гарадзінскага жэтонам ударніка і грашовай узнагародай—150 руб.

б) Брыгадзіра па справе мабілізацыі сродкаў па Касьцюковіцкім раёне, члена праўленьня прафсаюзу ФБР тав. Слаўкозіча—жэтонам ударніка і грашовай узнагародай — 150 руб.

в) Брыгадзіраў газэты «Рабочий» па справе мабілізацыі сродкаў у Магілеўскім раёне і ліквідацыі фінансавага прарыву на ф-цы імя Валадарскага тав. Капа і работніцу Менскай фабрыкі «1 мая» тав. Каваленка грашовай узнагародай кожнага па 100 руб.

г) Рахункаводаў Верхменскага сельсавету, Смалявіцкага раёну тт: Зьве рава і Цітова грашовай узнагародай па 75 руб.

9: Даручыць сэктару масавай работы і мабілізацыі сродкаў закупіць курортных мест на 5000 руб. для лячэньня ўдарнікаў фінансавага фронту у 1932 г.

10. Адзначаючы вялізарную ролю, якую адыгралі рэспубліканскія і некаторыя мясцовыя газэты ў справе арганізацыі мас на выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў мінулага году, прасіць рэдакцыі ўсіх рэспубліканскіх і мясцовых газэт яшчэ больш праз друк узмацніць барацьбу за сыстэматычнае, з дэкады ў дэкаду выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў шляхам штодзённага асьвятленьня гэтага пытаньня на сторонках друку.

11. Улічваючы, што «сутнасьць бальшавіцкага наступленьня састаіць, далей, у тым, каб мабілізаваць максымум сродкаў на справу фінансаваньня нашай індустрыі, на справу фінансаваньня нашых саўгасаў і калгасаў» (Сталін), Народны камісарыят фінансаў БССР заклікае ўсіх работнікаў фінансава - крэдытнай сыстэмы БССР і надалей на справе зесьці актыўную барацьбу за сыстэматычнае, з дэкады ў дэкаду, выкананьне пляну бягучага, заключнага году пяцігодкі. Усім фінансавым органам, улічваючы лепшыя формы і прыклады работы ў мінулым 1931 годзе разгарнуць шырокую арганізацыйна - масавую работу і скарыстаць фінансавы паход для замацаваньня дасягнутых посьпехаў і забясьпячэньня выкананьня і перавыкананьня пляну мабілізацыі сродкаў у 1932 г.

12: Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Народны камісар фінансаў БССР

А. Хацкевіч.

30.000 руб. для прэм'яваньня лепшых барацьбітаў за фінплян

Народны камісарыят фінансаў Саюзу ССР выдаў у распараджэньне Народнага камісара БССР 30.000 р. для прэм'яваньня перадавых раёнаў, гарадоў і прадпрыемстваў, калгасаў і іншых арганізацый і актывістаў-ударнікаў фінансавага фронту за перабудову работы, за бальшавіцкія тэмпы па мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў IV квартале 1931 году.

Работнікі дзяржбанку ўключыліся ў фінансавы паход

Гэтымі днямі мясцком дзяржбанку абгаварыў на сваім паседжаньні пытаньне аб правядзеньні Ўсебеларускага фінансавага паходу.

Улічваючы, што фінансавы паход мае вялікае палітычнае значэньне ў сэнсе пасьпяховага выкананьня фінпляну 1 кварталу і забясьпечвае бальшавіцкія тэмпы ў рабоце па выкананьні фінпляну на 1932 г., мясцком пастанавіў уключыцца ў правядзеньне яго і мабілізаваць усіх работнікаў дзяржбанку на выкананьне задач, якія стаяць перад фінпаходам.

І.

Дэкаднік штурму збожжазагатовак

Скончыць збожжазагатоўкі да 23 студзеня

З гонарам перамогі сустрэць 14 зьезд КП(б)Б

Другая пяцідзёнка студзеня дала зусім незначны зрух, хоць і абвешчаны дэкаднік штурму збожжазагатовак.

Гадавы плян па БССР выкананы ўсяго на 79,6 проц.

Рад раёнаў не дабіўся належнага пералому, не пераключыўся на поўнае заканчэньне збожжазагатовак да 14 зьезду КП(б)Б.

Бярэзінскі, Нараўлянскі, Рагачэўскі, Тураўскі і Чэрвэньскі раёны за другую пяцідзенку збожжа зусім не здалі.

Як і раней у глыбокім тыле знаходзяцца Старадароскі, Петрыкаўскі, Буда-Кашалеўскі, Лоеўскі, Чавускі і Мазырскі раёны, якія не дасягнулі 1 60 проц. выкананьня гадавога пляну.

Гэтыя лічбы яскрава сьведчаць аб тым, што большасьць адсталых раёнаў усё яшчэ не разгарнулі сапраўды ўдарных тэмпаў масавай работы, якія-б забясьпечылі выкананьне і перавыкананьне пляну збожжазагатовак да XIV зьезду КП(б)Б.

Партыйныя і савецкія арганізацыі адстаючых раёнаў няўмела расставілі свае сілы і ня здолелі мабілізаваць ўвесь грамадзкі актыў, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў на адначасовае выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Адставаньне аднаасобнага сэктару зьяўляецца красамоўным доказам слабага разгорнутай масава-палітычнай работы сярод беднякоў і серадняковаднаасобнікаў, і зусім слабага націску на кулацка-заможныя элемэнты вёскі, якія ўпарта ўхіляюцца ад выкананьня цьвёрдых заданьняў.

Вакол гэтага пытаньня не мабілізавана ўвага груп беднаты, у выніку—выкананьне цьвёрдых заданьняў па БССР дасягнула толькі 41 проц.

Перадавыя Каралінскі, Асьвейскі, Бешанковіцкі, Лёзьнянскі, Лепельскі, Сеньненскі, Сіроцінскі, Сураскі і Уваравіцкі раёны, якія значна перавыканалі свае пляны, зараз ідуць пад баявым сьцягам сустрэчных плянаў збожжазагатовак і выкананьня іх да XIV зьезду КП(б)Б.

У гэтых раёнах па сапраўднаму разгорнута масавая работа па мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадняковаў на барацьбу за пяршынства ў абвешчаным ЦК КП(б)Б і СНК БССР штурме збожжазагатовак і Ўсебеларускім конкурсе, абвешчаным Наркамснабам і газэтай «Зьвязда».

Адстаючыя раёны павінны неадкладна падхапіць прыклад перадавікоў, разгарнуць шырокую масава-палітычную работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і серадняковаў, папулярызаваць апошнія пастановы ЦК КП(б)Б аб збожжазагатоўках, правесьці рэйд ЦКК НК РСІ СССР, ЦО «Правда» і «Соц. Земледелие», па бавовому правесьці штурм і з гонарам перамогі сустрэць XIV зьезд КП(б)Б.

А. КУРДО.

Вопыт пасылкі буксірных брыгад—на ўсе с.-с. і калгасы БССР

ВІЦЕБСК. (Белта). Елагінскі сельсавет і партячэйка сваячасова мабілізавалі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкую частку аднаасобнікаў на ўдарнае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай па загатоўках збожжа. Пляны загатовак сваячасова былі даведзены да калгасаў, беднякі і серадняковы аднаасобнікі бралі на сябе самаабвязацельствы па здачы збожжа. Калгасьнікі разам з беднякамі і серадняковамі аднаасобнікамі арганізоўвалі чырвоныя абозы. Туды, дзе былі прарывы, накіроўваліся буксірныя брыгады з калгасаў, якія ішлі першымі па загатоўках. На загатоўкі быў мабілізаваны ўвесь сельскі актыў і на 8 студзеня плян па збожжазагатоўках сельсаветам выкананы на 120 проц.

40 падвод збожжа—падарунак 14 зьезду КП(б)Б

ВІЦЕБСК. 13-І. (Белта). У падарунак 14 зьезду КП(б)Б і другой гарпартканфэрэнцыі ў Віцебск 12 студзеня прыбыў чырвоны абоз са збожжам у 40 падвод з калгасаў Шуменскага сельсавету.

Калгасы і с-сав. Віцебшчыны, бярэце прыклад з перадавых.

ЗВОДКА

выкананьня пляну збожжазагатовак па БССР на 10 студзеня 1932 г.

Па сыстэме Белкаапсаюзу	У процентах да гадавога пляну
1. Аршанскі	92,7
2. Асьвейскі	115,8
3. Бабруйскі	90,0
4. Бешанковіцкі	101,6
5. Віцебскі	73,2
6. Віцебскі	98,3
7. Вушацкі	87,2
8. Гарадоцкі	98,9
9. Горацкі	93,9
10. Гомельскі	121,8
11. Дрысенскі	—
12. Дуброўенскі	92,8
13. Крупскі	87,6
14. Койданаўскі	65,5
15. Лёзьнянскі	115,7
16. Лепельскі	105,6
17. Маенскі	96,7
18. Магілеўскі	77,7
19. Мсьціслаўскі	96,2
20. Полацкі	91,9
21. Расонскі	83,3
22. Сеньненскі	101,9
23. Сіроцінскі	106,4
24. Сураскі	156
25. Талочынскі	88,6
26. Чавускі	61,6
27. Чашніцкі	80,6
28. Шклоўскі	78,4

Усяго па сыстэме Белкаапсаюзу гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 88,8 проц.

Па сыстэме Белхлебжывсаюзу	
1. Асіпавіцкі	87,2
2. Барысаўскі	77,6
3. Брагінскі	63
4. Буда-Кашалеўскі	54 5
5. Быхаўскі	70,2
6. Бягомльскі	90,2
7. Бярэзінскі	81,8
8. Веткаўскі	71,6
9. Глускі	53
10. Жлобінскі	87,4
11. Жыткавіцкі	105
12. Заслаўскі	91,5
13. Камарынскі	54,4
14. Кармянскі	66,3
15. Каралінскі	112,7
16. Касьцюковіцкі	74
17. Клімавіцкі	82,4
18. Клічаўскі	61,3
19. Капыльскі	76,8
20. Краснапольскі	71,4
21. Крычаўскі	88,5
22. Лагомскі	84,3
23. Лельчыцкі	53,2
24. Лоеўскі	54,4
25. Любаньскі	60,8
26. Мазырскі	56.8
27. Нараўлянскі	96
28. Парыцкі	76,2
29. Плешчаніцкі	91,8
30. Прапойскі	57
31. Пухавіцкі	69,2
32. Пятрыкоўскі	57,9
33. Рагачэўскі	71,5
34. Рэчыцкі	58,7
35. Слуцкі	80,9
36. Смалявіцкі	81,7
37. Стара-Дароскі	39
38. Старобінскі	77,9
39. Тураўскі	81,6
40. Уваравіцкі	103,1
41. Вузьдзенскі	78.8
42. Хойніцкі	65,8
43. Церахоўскі	83,6
44. Чачэрскі	67,8
45. Чырвона-Слабодзкі	87,7
46. Чэрвеньскі	67,2
47. Чэрыкаўскі	94,7

Усяго па сыстеме Белхлебжывсаюзу гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 73,5 проц.

Усяго па БССР на 10 студзеня гадавы плян збожжагатовак выкананы на 79,6 пр.

Случчына ўключылася ў дэкадвік штурму

Рэдакцыям газэт „Правда“, „Соц. Земледелие“, „Савецкая Беларусь“

СЛУЦАК. Пры РКК РСІ з удзелам прадстаўнікоў рэдакцый газэт «Савецкая Беларусь», райгазэты «Ленінскі Шлях» і прадстаўнікоў РК ЛКСМБ адбылася нарада аб уключэньні ва Ўсесаюзны рэйд па праверцы завяршэньня збожжазагатовак і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Распрацавана канкрэтная праграма рэйду. Для правядзеньня рэйду мабілізавана 60 чал. партыйна-камсамольскага і рабселькораўскага актыву, праведзена нарада-інструктаж 35 чал. райпартактыву, якія ўключыліся ў рэйд і ўзялі на сябе абавязак узначаліць яго на мясцох, мабілізуючы на гэта нізавы друк, рабселькораў і калгасны актыў.

У цэнтры раёну пачаўся рэйд—праверка раённых кіруючых устаноў і МТС у тым, наколькі разгорнута работа па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і завяршэньня загатовак.

Старшыня РКК РСІ Ласман.

Прадстаўнік рэдакцыі газ. «С. Б.» Тоўсьцік.

Рэдактар газ. «Ленінскі Шлях» Бугроў.

Змагацца за ператварэньне школы ў сапраўды палітэхнічную

Сацыялістычным спаборніцтвам прадпрыемстваў

паскорым рэалізацыю рашэньняў ЦК партыі аб школе

Да ўсіх рабочых Менску, Віцебску і Гомелю

(З адозвы рабочых віцебскага заводу «Чырвоны Мэталіст» і інструманталь на-мэблевай фабрыкі).

ЦК УсеКП(б) у сваёй гістарычнай пастанове аб пачатковай і сярэдняй школе канстатуе, што ня гледзячы на вялізарнейшыя посьпехі ў галіне школьнага будаўніцтва, «карэнны недахоп школы ў сучасны момант заключаецца ў тым, што навучаньне ў школе не дае дастатковага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў і нездавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і для вышэйшай школы ўпаўне пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук (фізыка, хімія, матэматыка, родная мова, геаграфія і інш.)».

Пастанова ЦК патрабуе рашучай перабудовы ўсёй школьнай работы, што можа быць ажыцьцёўлена толькі пры актыўным удзеле ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Мы—рабочыя віцебскага заводу «Чырвоны Мэталіст» і інструманталь-на-мэблевай фабрыкі ў адказ на заклік гомельскіх рабочых, па-бальшавіцку ўключыліся ў рэалізацыю пастановы ЦК аб школе. Мы ўзялі на сябе абавязак—прымацаваныя да нашых прадпрыемстваў 8-ю і 16-ю ФЗС перавесьці ў сапраўдныя палітэхнічныя школы. Гэты абавязак, прадугледжаны дагаварамі паміж заводам, фабрыкай і школамі, мы рэалізуем на справе.

1. Рабочыя заводу «Чырвоны Мэталіст» абсталявалі пры 8-й ФЗС 2 майстэрні па апрацоўцы мэталю і дрэва, з прапускной здольнасьцю ў 25 вучняў кожная.

2. Вылучылі рабочага-ўдарніка на пасаду загадчыка майстэрняні і намесьніка загадчыка 8-й ФЗС і 2-х інструктароў для майстэрні і рабочага пакою 16-й ФЗС.

3. Адпусьцілі 2.500 руб. на мэханізацыю майстэрні 8-й ФЗС і 550 руб. на два маторы і токарны варштат для 16-й ФЗС.

4. Мы вызначылі ў цэхах працоўныя месцы для правядзеньня вытворчага навучаньня вучняў 2-га канцэнтру.

5. Кожны цэх узяў шэфства над пасобнай групай школы.

6. Вызначылі фонд у 2.600 руб. на ўсенавуч на заводу «Чырвоны Мэталіст» і 500 руб. на інструманталь-мэблевай фабрыцы.

7. Дапамагаем ў рамонце школы, як матар'ялямі, так і непасрэдным удзелам.

8. Арганізуем вытворчую практыку для пэдагогаў школы.

9. Вылучылі брыгады для ўдзелу ў складаньні палітэхнічнага аналізу заводу і фабрыкі, навучальных праграм і плянаў.

10. Удзельнічаем у працы школьных арганізацый.

11. Вылучылі сацыялістычнага намесьніка ў 8 і 16-ю ФЗС.

12. Забясьпечылі працуючых вучняў і ўвесь пэдпэрсанал абедамі.

13. Інструманталь-на-мэблевая фабрыка забясьпечвае інструментамі, сыраві най і паўфабрыкатамі рабочы пакой і сталярную майстэрню 16-й ФЗС.

Мы—рабочыя заводу «Чырвоны Мэталіст» і інструманталь на - мэблевай фабрыкі—зварачаемся да ўсіх рабочых Віцебску, Менску і Гомелю з заклікам—па-бальшавіцку ўключыцца ў барацьбу за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб школе.

Мы лічым, што, вядучы барацьбу за ператварэньне савецкай школы ў сапраўды палітэхнічную, мы змагаемся за генэральную лінію партыі, мы вырашаем праблему кадраў для нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Рад прадпрыемстваў адхіляецца ад шэфства над школай, ад дапамогі школе ў яе перабудове, ня лічыць сябе адказным за школьную работу, альбо вырашаюць гэтую справу чыста фармальна, што зьяўляецца апартунізмам на практыцы, з якім кожны рабочы павінен змагацца з усёй бальшавіцкай рашучасьцю. Мы заклікаем усіх рабочых жорстка змагацца з усяк лякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, з ігнараваньнем дырэктыў партыі і савецкай улады. Мы бярэм на грамадзкі буксір завод «Камінтэрн» і фабрыку гнутай мэблі, якія зьяўляюцца «узорам» апартуністычных адносін да выкананьня пастановы ЦК аб школе (недапушчэньне 12-й школы да вывучэньня вытворчых працэсаў на заводзе, адсутнасьці ўсялякай ўвязкі і дапамогі гэтай школе ў працы і г. д.).

Чакаем Вашага слова, таварышы рабочыя, Менску, Віцебску і Гомелю.

Па даручэньні агульнага сходу рабочых заводу «Чырвоны Мэталіст»: Сакратар парткалектыву Рабкін, дырэктар заводу Сухаручкін, старшыня заўкому Мацвееў, загадчык 8-й школы Пятроў, рэдактар шматтыражкі Пімштэйн.

Па даручэньні агульнага сходу рабочых інструманталь-на-мэблевай фабрыкі: сакратар парт'ячэйкі Шафранаў, дырэктар фабрыкі Ісьянзў старшыня фабкому Мейцін, загадчык 16-й ФЗС Гімельштэйн, сакратар камсамольскага калектыву Саладухін.

Рабочыя ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі“

чакаюць адказу ад ф-кі „Прафінтэрн“

У адказ на зварот рабочых Віцебскага заводу «Чырвоны Мэталіст» і інструманталь-на-мэблевай фабрыкі, рабочых-швэйнікі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» рапартуюць, што, на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе, у справе палітэхнізацыі прымацаваных да іх 11-й ФЗС і 6-й пачатковай школы, яны дасягнулі наступнага:

Арганізавалі вытворчую практыку вучняў другога канц

Бабруйскі гарсавет

павінен узьняць масавую работу сэкцый і дэпутацкіх груп

«Савецкая Беларусь» ужо адзначала недастатковую ўвагу партколектыву Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату да справы разгортваньня работы дэпутацкіх груп. Але да гэтага часу партколектыў камбінату яшчэ не наладзіў работу ў гэтым напрамку. Цэхкамітэты ня цікавяцца работай дэпутацкіх груп, ня ведаюць складу дэпутатаў. Па радзе цэхаў дэпутацкія групы яшчэ не арганізаваны.

Ня лепшая справа на швейнай фабрыцы. Сход савецкага актыву, скліканы па пытаньні арганізацыі дэпутацкай групы, не адбыўся з прычыны ледабайных адносін да арганізацыі яго з боку партколектыву. Сакратар партколектыву т. Гонікман зусім ня цікавіцца работай дэпутатаў. Фабрыка на ват ня мае ўліку дэпутатаў.

Па радзе іншых прадпрыемстваў Бабруйску (заводы імя Сталіна, імя Томскага, фабрыка імя Халтурына) і ня арганізаваны дэпутацкія групы—работа гэта ня рушыцца з месца з прычыны адсутнасьці зацікаўленасьці з боку партыйнай арганізацыі і ня дбайных адносін фабзаўкомаў.

Райком партыі і гарпрафсавет абавязаны зьвярнуць больш увагі на савецкую работу на прадпрыемствах Бабруйску, павінны прымусіць парторганы і прафарганізацыі прадпрыемстваў узяцца за арганізацыю гэтай справы.

Рабкор.

Наладзіць працу сэкцыі пры Кручанскім сельсавеце

У Кручанскім сельсавеце (Талачынскага раёну) сэкцыі зусім ня існуюць. Старшыня сельсавету т. Ярковіч Алесь у гэтым напрамку нічога не зрабіў. Толькі нядаўна пры сельсавеце арганізавана сэкцыя РСІ. Адсутнасьць масавай работы сэкцый прывяла да зрыву работы ў калгасах. У рад калгасаў («Зьвязда», «1 Мая») залезьлі кулакі і былыя стражнікі. Старшыня сэкцыі РСІ Шабусаў Ціхан абараняе былых стражнікаў, свайго брата Шабусава Сям., гр. Халіцкага Андрэя і кулакоў Яркавіча і Ермалая і Кавалёва Карнея. Кулакі вядуць шалёную агітацыю супроць калгасаў. У калгасе «1-га Мая» з-за шкодніцтва згніло 4 га лёну і 5 га сена.

У калгасе «Зьвязда» ляжыць апрацаваны лён, які не здаюць дзяржаве. На запытаньне ў старшыні калгасу Пажарыцкага Пракопа, чаму ў вас ня здадзен лён, ён кажа—«Гэты лён нам самім патрэбны». У гэтым жа калгасе корм (сена) гніе пад подсьпіл. Калгас ня здаў піводнага кілё сена. Мясцовая партыйная і камсамольская ячэйка апартуністычна адносіцца да гэтага зьявішча. Старшыню сэкцыі РСІ пры сельсавеце Шабукова Ціхана трэба зараз-жа зьняць з работы. Трэба ачысьціць калгас ад варожых кулацкіх элемэнтаў і наладзіць масавую работу сэкцыі сельсавету.

Гдаля Трапер.

XIV зьезду КП(б)Б ЦВК БССР, га. „Савецкая Беларусь"

Рапарт ячэйкі КП(б)Б Людзянэвіцкага сельсавету

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі і яе ленінскага ЦК ячэйка КП(б)Б і Людзянэвіцкі сельсавет, Жыткавіцкага раёну, у выніку няўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі і рашучай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі ўступілі ў чацьверты заключны год пяцігодкі са значнымі посьпехамі на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У мінулым годзе наш сельсавет быў калектывізаваны на 34 проц., а зараз—на 49,2 проц.

Мы лічым сваёй асноўнай, галоўнай задачай—арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, шляхам практычнага ажыцьцяўленьня ў калгасах шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна, і, на яго аснове—далейшае разгортваньне калгаснага руху.

З 8 калгасаў на зьдзельшчыну пераведзена 7. Асноўныя віды работ выконваюцца паводле прынцыпу зьдзельшчыны, вылічанай ў працаднёх, па колькасьці і якасьці затрачанай працы. Усім калгасьнікам выданы працоўныя кніжкі і вядзецца правільны вучот працадзён. Усё больш укараняецца ў калгасах брыгадны мэтад працы.

У большасьці калгасаў ліквідава на абязьлічка ў адносінах да жывёлы і інвэнтара.

У выніку праведзенай масавай работы плян асноўных відаў загатовак выкананы датэрмінова і са значным перавышэньнем заданьняў.

Плян збожжазагатовак выкананы па сельсавеце на 115,4 проц. у тым ліку калгасамі на 147,8 проц.

Пляны мясазагатовак—109 пр., бульбазагатовак—101,3 проц.

Плян мабілізацыі сродкаў таксама—на 100 проц., за што наш сельсавет быў прэм'яваны.

У галіне культурнага будаўніцтва мы маем наступныя посьпехі: 100 проц. ахоп усенавучам дзяцей школьнага ўзросту; у сельсавеце 7 школ, у лік якіх уваходзіць 1 ШКМ, 5 беларускіх і 1 яўрэйская школа; у сельсавеце арганізавана 10 ліквпунктаў і школ малапісьменных.

Але побач з гэтымі посьпехамі мы маем і рад недахопаў, асабліва ў разгортваньні работы сэкцый і дэпутацкіх груп, у выкананьні пляну лесавывазкі, камплектаваньня МТКФ, СТКФ, птушкаводнай фэрмы і інш.

Мы запэўніваем XIV зьезд КП(б)Б, ЦВК БССР і газэту «Савецкая Беларусь», што змагаючыся за месца ў «Чырвонай кнізе саветаў», мабілізуючы на гэту справу калгасныя бядняцка-серадняцкія масы мы з посьпехам зьнішчым усе недахопы, якія маюцца ў бліжэйшы час і ўзьнімем масавую работу сельсавету на вышэйшую ступень.

Няхай жыве XIV-ы зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, якая пасьпяхова вядзе масы працоўных да канчатковай перамогі будаўніцтва сацыялізму!

Сакратар Людзянэвіцкай ячэйкі КП(б)Б ШКЛЯВЕР.

Старшыня Людзянэвіцкага сельсавету ВАСІЛЕЎСКІ.

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР аб дыфэрэнцыяваным кіраўніцтве і сувязі з раёнамі

Заслухаўшы даклад т. Лонскага аб выніках праверкі становішча дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва і жывой сувязі з раёнамі, Калегія НКФ БССР адзначае:

1. Народны Камісарыят Фінансаў у адпаведнасьці з пастановай Сэкі ЦВК БССР за сьнежань 1930 г. паступова перабудаваў структуру свайго апарату ў напрамку прыстасаваньня яго да вырашэньня фінансавых задач далейшага абслугоўваньня раёнаў. Па вялікэньне ўдвойчы колькасьці галінных падзяленьняў Наркамату (13 сэктараў замест 6 кіраўніцтваў) спрыяла дэталізацыі кіраўніцтва па розных галінах працы, спрыяла набліжэньню Наркамату да канкрэтных фінансавых спраў, да штодзённага кіраўніцтва раёнамі.

Аднак, зьменамі ў структуры яшчэ не дасягнута мэта поўнага сталага дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва раёнамі і пры новай структуры, з прычыны нячоткага яе правядзеньня ў штодзённай працы сэктароў Наркамату.

2. Жывое кіраўніцтва раёнамі, хоць і ўжывалася даволі шырока (разьбіўка раёнаў на 7 груп, 193 выезды ў раёны за 9 месяцаў, выклікі раённых работнікаў у цэнтр), але яно насіла недастаткова сыстэматычны характар; інструктаваньне і дапамога раёнам у арганізацыі і наладжваньні сыстэматычнай працы рабілася толькі ў выключных выпадках. Формы пісьмовай сувязь з раёнамі ў асноўным засталіся старыя: недастаткова практыкуецца пасылка ў раёны лістоў з характарыстыкай і ацэнкай работы раёну за мінулы пэрыяд, з паказаньнем канкрэтных задач раёну на далейшы час; амаль не атрымлівае і наркамат ніякіх інфармацыйных лістоў з раёнаў, ня гледзячы на пастановы калегіі і загады наркамату.

3. Становішча вучоту фінансавых кадраў раёну, забясьпечаньне работнікамі раёнаў зьяўляецца нездавальняючым, у сувязі з чым маюцца выпадкі слабага скарыстаньня ўзрастаючага раённага гаразджкога актыву фінансавых работнікаў у адных раёнах і слабае ўкамплектаваньне іншых.

Выходзячы з гэтага і ў мэтах палепшаньня штодзённага кіраўніцтва раёнамі, Калегія НКФ пастанаўляе:

1. Арг.-інспэкт. сэктару разам з зацікаўленымі сэктарамі прыняць рашучыя крокі да палепшаньня інструктаваньня раёнаў па ўсіх асноўных пытаньнях фінансавай дзейнасьці. Інструктарам сэктару і іншым работнікам НКФ пасьля абсьледваньня работы райфа і іншых крэдытна - фінансавых устаноў, складаць на месцы канкрэтныя і чоткія прапановы, правядзеньне якіх забясьпечыла-б у далейшым нармальную работу райфа, а таксама дало-б магчымасьць НКФ шляхам пісьмовых запытаньняў і пры паўторнай праверцы работы ўстанавіць ступень палепшаньня работы райфа.

2. Гадавыя і квартальныя пляны абсьледваньня работы райфа ўвязаць з плянамі іншых арганізацый (БКО, БКЦ, Дзяржбанк і кіраўніцтва АК і ДК), што дасьць магчымасьць праз камплектныя выезды ў раёны і групавую праверку работы ўсёй фінансавай сыстэмы раёну вывучыць сапраўдны твар раёну як у сэнсе яго эканомікі, так і падрыхтаванасьці раёну да правядзеньня чарговых палітычна - гаспадарчых задач.

3. Сыстэматычна заслухоўваць на Калегіі даклады гарфа і райфа і саддаклады інспэктароў, абсьледваўшых работу райфа. Арг.-інспэктарскаму сэктару разам з зацікаўленымі сэктарамі скласьці плян выклікаў за гадчыкаў райфа для дакладу на калегіі.

Скласьці плян групавых нарад загадчыкаў райфа, а таксама і іншых работнікаў па спэцыяльных пытаньнях, праекты па гэтым пункце даручэньняў падаць наркому да 1-га лютага г. г.

4. Лічыць неабходным ня менш аднаго разу ў месяц даслаць раёнам дырэктыўны ліст НКФ'іну, які-б арыентаваў раённых работнікаў па фінансава - гаспадарчых пытаньнях да нага моманту, даваў-бы адказы на запытаньні раёнаў. Першы такі ліст скласьці не пазьней 25 студзеня. Кіраўніком сэктарой падабрать і афармініць усе неабходныя матар'ялы для дырэктыўнага ліста і падаць гэткія Арг. інспэктарскаму сэктару не пазьней 20 студзеня.

5. У мэтах сталага вывучэньня становішча работы райфа і гэтым самым устанаўленьня сапраўднага дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва раёнамі, даручыць Арг.-інспэктарскаму сэктару ў адпаведнасьці з загадамі наркома на падставе матар'ялаў інспэктароў і лістоў раёнаў складаць квартальныя агляды дзейнасьці райфа ва ўсіх галінах фінансавай работы. Першы такі агляд скласьці за IV квартал 1931 г. не пазьней 1 лютага 1932 году. Даручыць кіраўніком сэктароў у 10-дзённы тэрмін даць афармлены матар'ял аб рабоце райфа Арг.-інспэктарск. сэктару.

Намеціць 10 найбольш характарных раёнаў, якія абавязаць штомесячна прысылаць у НКФ інфармацыйныя справаздачы аб праробленай рабоце. Тт. Грунтфэсту і Дабравольскаму ўзгадніць намечаныя раёны, выпрацаваць і разаслаць схэму інфармацыйных справаздач да 1 лютага г. г.

6. На падставе матар'ялаў праверкі фінансавых кадраў, даручыць сэктару кадраў у двухдзённы тэрмін скласьці сьпіс рэзэрву раённых фінработнікаў з мэтаю прасоўваньня лепшых з іх на больш адказныя пасады, або выкарыстаньня іх у больш буйных раёнах; скласьці сьпіс раёнаў, падлягаючых укамплектаваньню ў бліжэйшыя два месяцы.

Бюджэтна-плянаваму сэктару ў 10-дзённы тэрмін скласьці плян выкліку 10 загадчыкаў райфа з дакладамі на пасяджаньнях калегіі аб выкананьні бюджэтаў з саддакладам аднаго або двух старшынь сельсаветаў выклікаемых раёнаў аб складаньні і выкананьні сельскага бюджэту.

7. Шырока практыкаваць мэтад бук сіру перадавых раёнаў адстаючым, як апраўдаўшы сябе сацыялістычны мэтад грамадзкай дапамогі. Для лепшага абмену вопытам практыкаваць абсьледваньне аднаго раёну працаўнікамі суседняга раёну. Арг.-інсп. і сэктару масавай работы і мабілізацыі сродкаў у дэкадны тэрмін распрацаваць і падаць наркому на зацьверджаньне, якія раёны выклікаюць на буксір і плян удзелу раёнаў у абсьледваньнях.

8. Сэктару вучоту і статыстыкі на падставе маючыхся матар'ялаў НКФ і падбору іх у іншых установах у месячны тэрмін скласьці фінансава-эканамічны даведнік у раённым разрэзе і (па-квартальна) сыстэматычна дапаўняць яго новымі матар'ялямі.

Сэктару вучоту і статыстыкі па ўзгадненьні з асобнымі сэктарамі выпрацаваць табель паштовых і тэлеграфных тэрміновых данясеньняў раёнаў НКФіну. Забараніць сэктарам патрабаваньне ад раёнаў зьвестак, якія ня будуць прадугледжаны табелем, альбо якія можна здабыць у самым апараце НКФ і ў іншых цэнтральных наркаматах і ўстановах.

Сэктару вучоту і статыстыкі распрацаваць прынцыпы пабудовы сыстэмы фінансавай справаздачнасьці, з тым, каб яна ў першую чаргу мела практычнае прымяненьне на мясцох.

9. Сэктару масавай работы мабілізацыі сродкаў і сэктару вучоту і статыстыкі прапрацаваць пытаньне і падаць праект дырэктывы раёнам аб мэтадах складаньня кантрольных лічбаў раёнамі з тым разьлікам, каб кантрольныя заданьні на наступны квартал даваліся на падставе матар'ялаў, атрыманых ад раёнаў за мінулыя кварталы.

10. З мэтай памяншэньня выдаткаў на паштовыя і тэлеграфныя мэты, ліквідацыі тузаньня раённага апарату забараніць кіраўніком сэктароў карыстацца пасылкай тэлеграм бяз ведама кіраўніцтва наркамату. Калі пасылка тэлеграм была зроблена бяз ведама кіраўніцтва па нядбайнасьці работніка, кошт такой тэлеграмы кіраўніцтва спраў павінна адносіць за рахунак пасылаўшага тэлеграмы.

З мэтай больш гібкага і сваячасовага абслугоўваньня райгарфінадзелаў, абавязаць кіраўніцтвы сэктароў падаваць адказы на тэлеграфныя запытаньні у той-жа дзень, на пісьмовыя, не патрабуючыя ўзгадненьня з іншымі наркаматамі або ўстановамі—праз два дні пасьля атрыманьня іх, на ўсе іншыя—не пазьней 5 дзён. Устанавіць як правіла, чоткасьць перапіскі і дзелавых узаемаадносін апарату НКФ з раёнамі.

11. Прапанаваць кіраўніком сэктароў пад іх асабістую адказнасьць на працягу пяці дзён выпрацаваць пляны працы на першае паўгодзьдзе 1932 году і апэрацыйны плян на першы квартал гэтага году. У далейшым, бяз ніякіх напамінкаў складаць квартальныя пляны і здаваць арг. інспэкт. сэктару за 10 дзён да наступленьня кварталу.

12. Прапанаваць кіраўніком сэктароў асоба ўважліва падрыхтоўваць дырэктывы нізавым прадпрыемствам-крэдытным органам. Ні ў якім разе не дапушчаць праектаў такіх дырэктыў і інструкцый, якія работнікамі райфа ня могуць быць зразумелымі, або даваць падвойнае тлумачэньне апошніх, дабіваючыся ад выканаўцаў складаньня апошніх чоткімі фармулёўкамі і канкрэтнымі прыкладамі, да мінімуму скарачаючы канстатуючую частку і дубліроўку наогул.

Групе рацыяналізацыі сыстэматычна вывучаць усе адсылаемыя з НКФ дырэктывы і на падставе матар'ялаў інспэкцыі, а таксама лістоў з раёнаў рабіць прапановы кіраўніцтву аб палепшаньні гэтай справы.

13. Арг. інспэктарскаму сэктару не пазьней як за тры дні да выезду інспэктароў у раёны паведаміць члена калегіі прымацаванага да групы раёнаў і адпаведных кіраўнікоў сэктароў аб раёнах, у якія накіроўваюцца інспэктары, кіраўніком сэктароў падбіраць усе неабходныя матар'ялы і пытаньні і да дню ад'езду інспэктароў здаваць кіраўніку арг. інспэкт сэктару.

14. Сэктару кадраў на працягу студзеня прыняць неабходныя крокі да ўкамплектаваньня арг. інспэктарскага сэктару работнікамі якія-б сапраўды маглі ажыцьцяўіць належны інструктаж і дапамогу раёнам, а таксама прыняць меры поўнага ўкамплектаваньня адпаведнымі работнікамі сэктару масавай работы і мабілізацыі сродкаў, прамысловасьці і таваразвароту, вучоту і справаздачнасьці. Кіраўніку сэктару кадраў у пяцідзённы тэрмін точна ўстанавіць (па колькасьці і якасьці) патрэбнасьць сэктараў у работніках і падаць плян укамплектаваньня іх на зацьверджаньне наркому.

15. Даручыць сэктару прамысловасьці і таваразвароту паставіць пытаньне перад прэзыдыумам Белкаапсаюзу аб тым, каб на працягу месяца выявіць і даслаць НКФ у раённым разрэзе зьвесткі аб каапераваным насельніцтве і аб колькасьці асоб, маючых права быць каапераванымі. зьвесткі павінны складацца з падразьдзяленьнем па сэктарох (рабочыя і служачыя, калгасьнікі і аднаасобнікі) і іх сярэдні пай на кожны сэктар. У далейшым такія зьвесткі павінны дасылацца кожны квартал.

16. Прызнаць неабходным выданьне фінансавага бюлетэню. Даручыць сэктарам арг. інспэктарскаму і масавай работы ў дзесяцідзённы тэрмін скласьці праект дагавору з Белта аб выданьні фінансавага бюлетэню, і так сама яго фінансаваньня. Праект дагавору і спосабаў фінансаваньня ў вызначаны тэрмін прадставіць наркому на зацьверджаньне. Сэктару выканаць ня праверыць і далажыць вынік выкананьня даручэньняў па выданьні масавай літаратуры па фінансавых пытаньнях.

Народны камісар фінансаў БССР А. Хацкевіч.

Ад Замежнага Аддзяленьня Сакратарыяту Прэзыдыуму ЦВК БССР

Грамадзяне, якія заяўляюць аб сваёй прыналежнасьці да чужаземнага грамадзянства, што пражываюць у СССР па відах на пражываньне па форме № 2 (зялёнага колеру), а такса ма асобы ,якія заяўляюць сябе чужаземцамі, але ня маюць відаў на пражываньне, у тым ліку і былыя ваенапалонныя гэтых катэгорый, для прыманьня за імі чужаземнага грамадзянства абавязаны не пазьней 1-га лютага 1932 г. прадставіць у Замежнае Аддзяленьне або ў Замежны стол адпаведную заяву, да якой павінны прыкласьці нацыянальны пашпарт і іншыя нацыянальныя дакументы, якія даводзяць іх права на чужаземнае грамадзянства. Асобам, што заяўляюць аб грамадзянстве краін, якія маюць у СССР пасольствы, місіі і консульства, і якія ня маюць нацыянальных пашпартоў, раіцца зьвярнуцца ў пакаваныя замежныя ўстансвы з просьбай аб выдачы нацыянальных пашпартоў. Пасьля вышэйпаказанага тэрміну заявы аб прызнаньні чужаземнага грамадзянства Замежным Аддзяленьнем Сакратарыяту Прэзыдыуму ЦВК БССР прымацца ня будуць. Асобы, якія ўжо ўзбудзілі хадайнічаньні аб прызнаньні за імі чужаземнага грамадзянства, таксама абавязаны зьявіцца не пазьней паказанага тэрміну для атрыманьня адказу на паданыя імі хадайнічаньні аб прызнаньні за імі правоў чужаземнага грамадзянства. Пры ём заяў аб прыналежнасьці да чужаземнага грамадзянства ўтвараецца шляхам асабістай падачы заяў. У выпадку немагчымасьці асабістага прыбыцьця заяўніка па хваробе, інвалідзнасьці і іншых уважлівых прычынах дапускаецца перасылка неабходных дакумантаў і заяў заказнымі паштовымі пакетамі і праз іншых асоб, з абавязковым дадаткам урачэбных пасьведчаньняў, або іншых дакумантаў, якія засьведчаны мясцовымі сельсаветамі, што пацьвярджаюць немагчымасьць асабістай яўкі. На грамадзян, якія пражывалі да гэтага часу па відах на пражываньне для чужаземцаў па форме № 1 (ружовага колеру), гэта аб'ява не распаўсюджваецца, а пагэтаму яўцы паводле гэтай аб'явы яны не падлягаюць. Не распаўсюджваецца гэта аб'ява таксама і на асоб, якія нелегальна перайшлі мяжу і маюць віды на пражываньне па форме № 2. Грамадзяне, якія пражываюць на абшарах БССР, падаюць хадайнічаньні ў ніжэйнаступныя замежныя сталы:

1. У Замежны стол Віцебскага гарсавету — пражываючыя ў раёнах: Бешанковіцкім, Гарадоцкім, Лёзьнянскім, Сеньненскім, Суражскім, Сіроцінскім, Чашніцкім і Віцебскім прыгарадным раёне.

2. У Замежны стол Полацкага РВК: пражываючыя ў раёнах: Асьвейскім, Вушацкім, Дрысенскім, Расонскім і Полацкім.

3. У Замежны стол Аршанскага РВК пражываючыя ў раёнах: Дубровенскім, Горацкім ,Крупскім, Лепельскім, Талочынскім і Аршанскім.

4. У Замежны стол Бабруйскага РВК: пражываючыя ў раёнах: Асіпавіцкім, Глускім, Кліча́ўскім, Любаньскім, Парыцкім, Старобінскім, Слуцкім, Стара - Дароскім, Чырвона - Слабодзкім і Бабруйскім.

5. У Замежны стол Магілеўскага РВК, пражываючыя ў раёнах: Быхаўскім, Бялыніцкім, Касьцюковіцкім, Клімавіцкім, Кармянскім, Краснапольскім, Крычаўскім, Мсьціслаўскім, Прапойскім, Шклоўскім, Чавускім, Чэрыкаўскім і Магілеўскім.

6. У Замежны стол Гомельскага гарсавету, пражываючыя ў раёнах: Брагінскім, Буда-Кашалеўскім, Веткаўскім, Жлобінскім, Камарынскім, Лоеўскім, Рагачоўскім, Рэчыцкім, Уваравіцкім, Хойніцкім, Церахоўскім, Чачэрскім і Гомельскім прыгарадным раёне.

7. У Замежны стол Мазырскага РВК, пражываючыя ў раёнах: Лепельскім, Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Нараўлянскім, Петрыкаўскім, Тураўскім і Мазырскім.

У Замежнае аддзяленьне Сакратарыяту Прэзыдыуму ЦВК БССР—пражываючыя ў раёнах: Менскім прыгарадным, Барысаўскім, Бярэзінскім, Гомельскім, Вузьдзенскім, Заслаўскім, Койданаўскім, Капыльскім, Лагойскім, Плешчаніцкім, Пухавіцкім, Смалявіцкім і Чэрвеньскім.

Загадчык Замежнага Аддзяленьня Сакратарыяту Прэзыдыуму ЦВК БССР Губскі.

Новы Гукавы і гав. мастацкі фільм вытв. Ленінгр. ф-кі Саюзкіно „СНАЙПЭР"

Бэргардт Гэтцке у карціне П сынкі Бэрліну

Эміль Янінг у карціне Чалавек і ліўрэя

Цэнтральны Камітэт Т-ва Чырвонага Крыжу БССР (Менск, Першамайская, 7)

ШУКАЕ наступных грамадзян, якім належыць спадчына пасьля памершых у Амэрыцы родных:

Леўчук Марфу — жонку Леўчука Івана.

Хэйфэц Алеся Іванава (артыстага)—родзіча Іоффэ Эльці Шабшэлеўны—спадчына з Нямеччыны.

Жонку Арцюшыка Рыгора.

Расшукваецца таксама Яйзэм Ян—былы вайсковы палонны.

Розічай Зандбэрг Сарры.

„ТОРГСИН" ВЫТВАРАЕ ПРЫЕМ АД УСІХ ГРАМАДЗЯН ЗОЛАТА (лом, у вырабах, зьліткі і інш.) і аплачвае поўную каштоўнасьць яго таварамі па выбару з Унівэрмага па Ленінскай, 15.

Там-жа вытвараецца продаж тавара-прадуктаў усім грамадзянам на замежную валюту і залатую манэту старай чаканкі.

ПРЫЁМ ЗОЛАТА вытвараецца штодзённа ад 10 гадзін да 6-й гадзіны ўвечары па Ленінскай вуліцы № 14. (супроць гарадзкой аптэкі)

ТОРГСИН

Паведамляецца, што 19 студзеня г. г., а 10 гадз. раніцы у залі пасяджаньняў СНК

АДБУДЗЕЦЦА ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ Усебеларускага Штабу садзейнічаньня лесазагатоўкам, вывазцы дроў, торфу і лесаматар'ялаў пры СНК БССР з наступнай абавязковай дню:

Даклады раённых штабаў садзейнічаньня пры РВК: Клічаўскага, Петрыкаўскага, Чэрвеньскага, Лельчыцкага, Уваравіцкага, Магілеўскага, і Заслаўскага аб ходзе выкананьня плянаў лесазагатовак, вывазкі дроў торфу і лесаматар'ялаў і аб праробленай у гэтым напрамку рабоце паказаных райштабаў.

Яўка членаў Усебеларускага Штабу і старшынь паказаных райштабаў абавязкова.

Старшыня Ўсебеларускага Штабу садзейнічаньня лесазагатоўкам, вывазцы дроў, торфу і лесаматар'ялаў пры СНК БССР БАГІН.

АБВЯШЧАЕЦЦА ПРЫЕМ АСЬПІРАНТАЎ на вячэрні сэктар эканамічнага аддзяленьня ІНСТЫТУТУ АСЬПІРАНТУРЫ БАН

Прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б са стажам раб. на вытворчасьці або парт. і грамадзк раб ня менш 3-х год, а таксама члены КСМ з вытворчым стажам ня менш 3-х год не старэй 35 год якія маюць асьвету ў аб'ёме ВНУ адпаведнай спэцыяльнасьці.

ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА да 18-га студзеня 1932 г.

ДА ЗАЯВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЫКЛАДЗЕНЫ:

1. Камандыроўка партыйных або камсамольскіх арганізацый.
2. Засьведчаная анкета.
3. Пасьведчаньне аб скончэньні навучальнай установы.
4. Даведка аб стане здароўя.
5. Друкаваныя працы, калі такія ёсьць.
6. Даведка ўстановы, у якой працуе паступаючы у Інстытут, аб адсутнасьці перашкод да паступленьня.

Правяраючая канфэрэнцыя па дыямату, палітычнай эканоміі, гісторыі клясавай барацьбы, гісторыі партыі адбудзецца паміж 15 і 20.

Слухачы вячэрняга сэктару стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца.

Заявы накіроўваць: Менск, Інстытут Асьпірантуры БАН.

Дырэктар Інстытуту Асьпірантуры БАН РЫЎЛІН

Дзяржарбітраж пры СНК аб'яўляе, што арганізацыі і прадпрыемствы, якія падаюць іскі ў Дзяржарбітраж павінны пры заяве прыкладваць квітак банка аб уплаце 2 проц. мыты з цаны іску. Таксама копію заявы пасылаць непасрэдна адказчыку, які на працягу 3-х дзён павінен падаць у Дзяржарбітраж тлумачэньне па сутнасьці справы.

Дзяржарбітраж пры СНК БССР

ПАКРАДЗЕНЫ

1. Пасьведчаньне на права пражываньня ў пагранпаласе. 2. Пасьведчаньне аб скончэньні 6-шмесячных курсаў тэхніка-пчаляроў на імя Залаціло К. П., жыхара вескі Зьвячы, Заслаўскага раёну.

Лічыць несапраўднымі

ЗГУБЛЕНА вялікае вязацельства за № 103.84. Сэрыя 4, на імя Малышава І. Ф.

Лічыць несапраўдным

ПАКРАДЗЕНЫ

Ашчадная кніжка на 552 руб., акрэдытыў без кантрольнага ліста на 400 руб. за № 708065, выданыя ашчадкасай № 194, гор. Першамайску. Ашчадная кніжка на 400 руб., выд. ашчадкасай на поўце г. Першамайску. Ашчадная кніжка ашчаакасы Дзяржбанку гор. Першамайску на 50 руб.

Усе дакумэнты на імя Пацешчанка Н. Л.

Паказаныя дакумэнты лічыць несапраўднымі з 15-I 32 г

Пасьведчаньне выд. Смалявіцкім ваенкаматам на імя Чыгунова П. Квіт. 1139 п.

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

20 сьнежня 1931 г. Народным Камісарыятам Фінансаў БССР на падставе арт. 2-4 палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, паст. 99)

ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ за № 94 (дзевяноста чатыры)

Беларускае Скурана-Абутковае Аб'яднаньне Прамысловай Каапэрацыі „БЕЛКААППРАМСКУР"

Аб'яднаньне знаходзіцца ў веданьні Беларускага Саюзу Прамысловай Каапэрацыі

МЕСЦАЗНАХОДЖАНЬНЕ АБ'ЯДНАНЬНЯ: гор. Менск, Інтэрнацыянальная, 9.

Кантакарэнтны рахунак у Дзяржбанку № 70190.

Беларускі Дзяржаўны Аўта-Дарожны Інстытут АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ на ВЯЧЭРНІ РАБФАК (3 курс і 4 курс паскоранага выпуску для асеньняга набору ў Інстытут) 240 асоб.

Прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, батракі і беднякі на базе 7 і 8-мігодкі.

Абавязковыя дакумэнты: 1. Камандыроўка адпаведнай арганізацыі, 2. Заверная анкета, 3. Аб стане фізычнай працы, 4. Аб узросьце, 5. Аб асьвеце 6. Аб стане здароўя, 7. Аб сацыяльным і маёмасным стане па тупаючага яго бацькоў, 8. Для сялян акладны ліст аб с.-г. падатку на 1930-31 г., калгасьнікаў, саматужнікаў—аб падатку на 1930-31 г.

Іспыты для асоб, ня маючых адпаведнай адукацыі, адбудуцца з 1 па 5 лютага г. г.

ЗАНЯТКІ ПАЧНУЦЦА з 15-га лютага 1932 г.

Дакумэнты дасылаць па адрасу: Менск, Інтэрнацыянальная вул., № 31, 2-гі паверх (1-я сямігодка). Канцылярыя адчынена з 5 гадз. да 10 гадз. увеч.

Прыём дакумэнтаў да 25-га студзеня 1932 г.

Дэкан Рабфаку ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

БІМЗО пры ЦК КП(б)Б паведамляе, што згодна пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б пры Камвузе Беларусі (Менск) арганізуюцца дэкадныя курсы кансультантаў завочнага партнавучаньня. Курсы адбудуцца з 20-I па 1-II 1932 г. Усе раёны павінны вылучыць ,згодна з дасланай разьвёрсткай ЦК, таварышоў. Таварышы забясьпечваюцца інтэрнатам і харчаваньнем, абавязкова патрэбна захапіць з сабой пасьцельныя прылады.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Папраўка

У зьмешчанай у газэце «Савецкая Беларусь» № 12 (3401) за 14 студзеня 1932 г пастанове № 4 Калегіі Наркамзямляробства БССР аб справаздачнасьці пра ход с. г. кампаніі 1932 году дапушчаны наступныя апячаткі:

1) У 1 разьдзеле ў тэксьце ўвагі тэлеграмы па ўборцы сенажаціў пасеваў і асеньняй сяўбы ў 8 строчцы пасьля слоў: вывезена з поля скошанага сена з плошчы 0 0 га прапушчана фраза: «Застагована скошанага сена з плошчы 0 0 га, зжата азімых на плошчы 0 0 га».

2) У разьдзеле «б» у тэксьце ўвагі тэлеграмы на падрыхтоўцы да вясновай сяўбы ў 30 строчцы пасьля слова пэнтнераў надрукавана г. д. патрэбна надрукаваць «у т. л.ку».

3) У разьдзеле «а» ў тэксьце ўвагі тэлеграмы аб ліку калгасаў, гаспадарак і іншым паказчыкам у 41 строчцы пасьля слоў у тым ліку ў сьвінафэрмах 0 0, надрукавана слова «працадзена» патрэбна надрукаваць «прададзена».

4) У пункце 9 у разьдзеле «а» ў другой строчцы пасьля слова калгасы прапушчана слова МТС і

5) у пункце 12 у першым радку пасьля слова ўсе надрукавана «раённыя» патрэбна надрукаваць «раней-шыя».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЗГУБЛЕНЫ:

Кніжка пайнікаў 1 наборныя лісткі ТПО Бабіцкай Ю. А. Квіт 1123.

Білет союзу дрэваапрацоўшчыкаў № 8403 Іваановіча Н. Т. Квіт 1123.

Бюлецень зубврача на імя Небышэнца Я. З 2 нов. Барысаўскай амбулятыры. Квіт. 1123.

Пропуск на фабрыку № Чырвоная Бярэзіна» на імя Міхневіча С. К. Квіт. 1123.

Пашпарт выд. Коханаўскім РВК на імя Анташкевіч. Квіт. 1122.

Білет союзу дрэваапрацоўшчыкаў № 8287 на імя Жабко З. П. Квіт. № 1123 п.

Пропуск на фабрыку «Чырвоная Бярэзіна» на імя Пранікава М. Г. Квіт 1123. п.

Паявая кніжка Суднікава Т. В. выд. Барысаўскім ТПО. Квіт. 1123. п.

Даведка ЦРК на імя Ганчарэнка М. Д. выд. Аршанскім ЦРК. Квіт1123.

Білет союзу хімікаў на імя Кальцова, 1 выд. 3-д Домбаль. Квіт 1123 п.

Паявая кніжка воднікаў на імя Кальцова, 1 выд. Н. Барысаўскім ЦРК. Квіт 1123 п.

Вайсковы білет Раманава, М., выд. Барысаўскім ваенкаматам. Кв 1123 п.

Тры наборных лісткі воднікаў на імя Яроша, А. выд. ЦРК Квіт. 1123п.

Кніжка ЦРК на імя Каракіна, 1 вып. ТПО. Квіт 1123. п.

Упаўнаваж. Галоўлітбел № А—58

Друкарня імя Сталіна.